незалежная газета

№ 19 (664) 19 мая 2010

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Чые грошы круцяцца ў мінскіх казіно**

Старонка 8

**Сакрэтная паездка Макея**

Старонка 2



**Гей-прайд жорстка разагналі**

Старонка 6




**У НУМАРЫ**

**Разбор палётаў**

Падчас парада 9 Мая была груба парушаная інструкцыя бяспекі Мінабароны. **Старонка 9.**

**Казулін намякае**

што зноў можа пайсці ў прэзідэнты. **Старонка 3.**

**Дырэктыва №4: прыватызацыя 75% актываў, зніжэнне падаткаў**

Пакуль гэта толькі піяр. Але характэрны. **Старонка 4.**

**Беларускі студэнт загінуў у Гданьску**

Канстанцін Жылінскі ад 2006 года вывучаў эканоміку. **Старонка 5.**


«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

ТУРЫСТЫЧНАЕ АГЕНЦТВА «ГІСТОРЫЯ-ТУР»

Карпаратыўны адпачынак у фальварку Карчэўскіх у Банюнах!

Аўтобусныя экскурсіі па Беларусі!

Адпачынак на моры і ў Еўропе!

Тур на фестываль: "Навагрaдскі замак" (26-27.06. 2010, Новогродок)!

Тур "Шлях на Грунвальд": Лідзбарк Вармінскі – Ольштын – Мальборк – Грунвальд (13-18.07.2010, Польшча)!

(029) 677 00 46 www.h-t.by

# Хто наступны сядзе ў гэтую машыну?

Аўто людзей, якія прэтэндуюць на найвышэйшую пасаду ў краіне. **Старонка 10.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Міліцыю зацікавіла праўда



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**18 мая міліцыя правяла ператрусы ў дзясяткаў актывістаў кампаніі «Гавары праўду».**

Такой скаардынаванай акцыі спецслужбаў супраць незалежнага грамадства даўно не было. У абед прыйшла вестка пра ператрус на цэнтральным офісе кампаніі ў Мінску. Пасля падобныя навіны прыйшлі з Брэста, Гомеля, Гродна, Барысава, Ваўкавыска і іншых гарадоў. У сілавікоў адназначна была падрабязная інфармацыя пра ўсе штабы кампаніі, а таксама пра яе актывістаў.

Найбольш вядомых каардынатараў «Гавары праўду» пасля затрыманняў на офісе везлі дадому, каб ужо там правесці дадатковы ператрус. Так было з рэдактарам газеты «Товарищ» Сяргеем Вазняком, з міжнародным сакратаром Аб'яднанай грамадзянскай партыі Андрэем Дзмітрыевым, журналістам Аляксандрам Уліцёнкам, палітолагам Святланай Навумавай. Вазняка і Дзмітрыева змясцілі на трое сутак у ізалятар часовага ўтрымання.

Да эксперта кампаніі, публіцыста Аляксандра Фядуты міліцыя таксама прыйшла дадому. Шукалі «рэчы, здабытыя злачынным шляхам». «Нічога, апроч мяне і дзесяці тысяч кніг у кватэры яны не знайшлі», — кажа А.Фядута.

Потым затрыманых адвозілі ў Ленінскае РУУС, дзе з імі праводзіліся невялікія допыты. Казалі, што заведзеная крымінальная справа па артыкуле 250 КК (распаўсюджванне лжывай інфармацыі пра тавары і паслугі).

Прадпрымальнік Віктар Гарбачоў з Барысава сказаў нам, што цікавіліся ўсім, што датычыць кампаніі «Гавары праўду», іх друкаванай прадукцыяй.

Ператрус з пагромам таксама прайшоў на офісе сацыялагічнай лабараторыі «Новак», якую ўзначальвае прафесар Андрэй Вардамацкі. Там адбыўся невялікі канфлікт паміж супрацоўнікам лабараторыі і міліцыянерам.

Сярод іншага, канфіскаваны «Чарнобыльскі звон», які традыцыйна нясуць на шэсці 26 красавіка. Скульптар Алесь Шатэрнік неасцярожна пакінуў яго ў пісьменніка Міхася Башуры, які таксама трапіў пад каток.

На масавыя вобшукі і затрыманні можна чакаць афіцыйнай рэакцыі з боку Брусэля і асобных краін ЕС.

А Расія? Па яе рэакцыі ці яе адсутнасці можна будзе меркаваць, якую пазіцыю Крэмль збіраецца заняць падчас прэзідэнцкіх выбараў.

**Зміцер Панкавец**

# Сакрэтная паездка Макея

**Кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей здзейсніў паездку ў Вашынгтон.**

Прычым візіт адбываўся ва ўмовах поўнай сакрэтнасці. Інфармацыі пра яго нідзе няма. Паводле неафіцыйных звестак, Макей праводзіў сустрэчы з прадстаўнікамі Адміністрацыі Абамы. Ягоная місія была ў тым, каб пераканаць амерыканцаў змяніць палітыку ў дачыненні да Беларусі.

Таксама Макей абяцаў вярнуць у звычайны рэжым працу пасольства. Ад сакавіка 2008 года амбасада ЗША працуе без пасла, а таксама істотна скарочаная колькасць дыпламатычных работнікаў.

Прэс-служба Лукашэнкі ніяк не каментуе звесткі пра такі візіт. А вось палітолаг Сяргей Мусіенка, які звычайна выказвае пазіцыю лукашэнкаўцаў па многіх пытаннях, заявіў для «Інтэрфакса»: «Я не ведаю, ці была такая паездка. Але лічу такую паездку не толькі рэальнай, але і вельмі патрэбнай».

ЗША ад пэўнага часу перасталі ставіць сабе за мэту змену рэжыму ў Беларусі. Яны актыўна намагаюцца наладзіць адносіны з лукашэнкаўцамі. У прыватнасці, яны падтрымлівалі вылучэнне крэдытаў МВФ для Беларусі і выбралі чакальную тактыку ў дачыненні да бліжэйшых прэзідэнцкіх выбараў.

Аднак адносіны Беларусі з ЗША заставаліся ў горшым стане, чым з краінамі Еўрапейскага Саюза, у выніку сітуацыі з амерыканскім пасольствам.

**Зміцер Панкавец**

## Сцісла

**• Юрасобам забаранілі выкарыстоўваць у найменнях словы «найлепшы», «першы», «адзіны».** У адпаведнасці з пастановай Мінюста, забаронена выкарыстоўваць найменні юрыдычных асоб са словамі ў найвышэйшай ступені параўнання, «якія дазваляюць пазіцыянаваць гэтую юрыдычную асобу ў якасці лідэра пэўнай галіны на падставе яе наймення».

**• Дакументы па справе Бакіева ў Генпракуратуру дагэтуль не паступалі.** Быў атрыманы толькі запыт аб выдачы Курманбека Бакіева па факсе, паведаміў генпракурор Рыгор Васілевіч. У ім указвалася, што поштай у Беларусь маюць паступіць матэрыялы. Але ліста так і няма. Лукашэнка заяўляў, што не выдасць Бакіева новым уладам Кыргызстана.

**• Рада Еўропы асудзіла новыя смяротныя прысуды ў Беларусі.** 14 мая Гродзенскі абласны суд прыгаварыў да найвышэйшай меры двух жыхароў Гродна. Яны прызнаныя вінаватымі ў забойстве з асаблівай жорсткасцю і выкраданні малалетняга. Адмяніць нядаўнія прыгаворы заклікалі старшыня Камітэта міністраў Рады Еўропы і кіраўнік Парламенцкай асамблеі Рады Еўропы (ПАРЕ). Беларусь — адзіная краіна ў Еўропе, у якой дагэтуль ужываецца смяротная кара.

**• Дзіцячае свавольства на перапынку прывяло да гібелі шасцікласніка.** Няшчасны выпадак адбыўся ў адной з бабруйскіх школ на вачах настаўнікаў і дзяцей. Адзін школьнік піхнуў другога. Шасцікласнік упаў на шкло, разбіў яго і аскепкам разрэзаў шыю. Уратаваць яго не ўдалося.

**• Панджавідзэ — галоўным рэжысёрам Оперы.** Творчую частку тэатра ўзначаліць расійскі спецыяліст. Міхаіл Панджавідзэ нарадзіўся ў 1969 годзе. Кіраваў рэжысёрскай групай Вялікага тэатра Расіі.

**СМ**

КАМЕНТАР

## ЗША адмовіліся ад змены рэжыму ў Беларусі

**Выглядае, што Вашынгтон гатовы перайсці да маўклівай нейтральнасці. Адзінай перашкодай застаецца прыватнае пытанне пасольства.**

Крокі Вашынгтона выразна паказваюць на змену курсу ў дачыненні да Беларусі. Была падтрымка праз МВФ — 3,5 мільярда. Змянілася стаўленне да беларускай палітычнай апазіцыі. Ад пэўнае пары яе, хутчэй, ігнаруюць.

З чым звязаная перамена? Няма двух варыянтаў адказу: з курсам Мінска на незалежнасць ад Масквы.

Лукашэнку не ўдалося скалупнуць, значыць, варта з ім лічыцца. Не рэвалюцыя, а набліжэнне. Мінск не будзе праціўнікам, пакуль не будзе ўлазіць у антыамерыканскія авантуры. Такой выглядае палітыка Абамы да Беларусі. Абамы, першыя крокі якога Лукашэнка вітаў.

Ах так, ёсць прыватнае пытанне пасольства, з якога беларускія ўлады выгналі амаль усіх дыпламатаў. Гонар не дазволіць ЗША заплюшчваць на гэта вочы. Аднак у выпадку вырашэння пытання з пасольствам нармалізацыя адносінаў з ЗША падаецца рэальнай.

Стаўленне ЗША да пытанняў дэмакратыі ў Беларусі тады можа «азербайджанізавацца». Гэта значыць, прынцыповая падтрымка правоў чалавека, але без настойвання на палітычных пераменах. І гатоўнасць да развіцця эканамічных кантактаў.

Апазіцыі прыйдзецца прыстасавацца да новай дадзенасці, якая можа зацягнуцца аж да змены курсу ў Вашынгтоне ці ў Мінску. На першае апазіцыя ўплываць не можа — хоць і цешыць сябе такой ілюзіяй, а вось другое цалкам у беларускіх руках.

У кожным разе, нармалізацыя адносінаў з ЗША дасць Беларусі дадатковыя аргументы ў няпростым дыялогу з Масквой. Незалежнасць ад таго ўмацуецца, дэмакратыя адкладаецца на пасля.

**Андрэй Дынько**

КУР'ЁЗ







**Прэзідэнту Украіны Віктару Януковічу не шанцуе. То ўпадзе, падбіты яйкам. То сутыкнецца з дзвярыма на ўласнай інаўгурацыі. А ў часе візіту Дзмітрыя Мядзведзева ў Кіеў яму на галаву ўпаў вянок. Не лаўровы, а рытуальны. Калі кіраўнікі дзяржаваў аддавалі даніну памяці невядомаму салдату ў Кіеве, парыў ветру скінуў адзін з вянкоў.**

Як ідэальна ўсё! Амаль ідыльна!
Прыйшоў Янук загіблых прывітаць
Яшчэ жывы... а ўжо вянок магільны
Стараецца яго захамутаць.

**Сяржук Сокалаў-Воюш**

## Вайцюшкевіч стаў салістам дзяржаўнага аркестра

Зміцер Вайцюшкевіч запрошаны ў якасці аднаго з салістаў нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя Жыновіча. У планах артыста — запісаць з аркестрам сольную праграму. Акром таго, выканаўца сыграе адну з галоўных роляў у пастаноўцы рок-оперы Ігара Лучанка «Гусляр», вядомую з кружэлкі «Песняроў». Плануецца, што Вайцюшкевіч сыграе ролю галоўнага адмоўнага персанажа — князя. Гусляром будзе Пётра Ялфімаў.

**ТГ, udf.by**

## Самае чытанае на nn.by за 12—18 мая

- «Гей−прайд 2010» у Мінску жорстка разагнаны + фоты і відэа
- «За 25 год лётнай практыкі я такога страшнага выпадку не бачыў»
- Аляксандр Зімоўскі абмаляваў сцэнар адхілення Лукашэнкі ад улады
- «Хлопчыку прыкладам разбілі ўсю галоўку»
- Сядзібы «Гавары праўду» трасуць ва ўсёй краіне
- Устаноўленыя аўтары нацысцкага банера на матчы «Дынама»
- Прычына смерці беларускага студэнта ў Гданьску пакуль невядомая
- Сакрэтная паездка Уладзіміра Макея
- Пяць плюсаў і пяць мінусаў Віталя Рымашэўскага
- Дзясяткі нацыянальных сцягоў у самым цэнтры Мінска

## nn@nn.by

На Бягомльшчыне на самой справе быў жах. Майго дзеда Глазко Сцяпана партызаны і расстралялі за тое, што адмовіўся ў лес ісці. А куды пойдзеш, калі дзяцей карміць трэба? Адмовіўся. Забілі. А потым і дзеці з голаду памерлі праз гэта.

**Wint (да артыкула пра падзеі вайны з №18)**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Адрз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй падпісчыкам,

які падпісваюцца праз Рэдакцыю

В.Ш. з Віцебскага раёну.
Генадзю К., Дзмітру В., Леаніле Г. з Мінскага раёну.
Канстанцыну К., Барысу Ч., Міхасю Б. з Магілёва.
Віктару С. з Лепельскага раёну.
Уладзіміру Я. з Барысаўскага раёну.
Уладзіміру Ц. з Лагойскага раёну.

# Пяць плюсаў і пяць мінусаў Аляксандра Казуліна


Турма падарвала здароўе Казуліна, але не дух.

Былому кандыдату на пасаду прэзідэнта і палітвязню Аляксандру Казуліну паведамілі, што з яго знятая крымінальная судзімасць. Гэта адкрывае перад Казуліным магчымасць удзелу ў прэзідэнцкіх выбарах. Моцныя і слабыя бакі гэтага кандыдата.

### 1. Рашучасць

**+** На мінулых прэзідэнцкіх выбарах Аляксандр Казулін прадэманстраваў свой моцны характар. Ён бескампрамісна крытыкаваў Лукашэнку і спрабаваў абвастрыць сітуацыю ў час акцый пратэсту. Годны Казулін з годнасцю перанёс суд і турэмнае зняволенне. З той кампаніі ён заслужыў сабе імідж тэрмінатара, марскога пехацінца. Нездарма ж з парашутам скакаў. Сапраўдны лось, а не казуля.

**–** Пасля вызвалення Казулін так і не знайшоў сваё месца ўнутры апазіцыі. Праз нейкі час актыўнасці палітык увогуле сышоў у цень. «Я думаю, што ён вельмі пакрыўджаны, і пакрыўджаны справядліва. Яму галаву адбівалі, у турму пасадзілі, а мы ўсё разбіралі, ці ён стаўленік Крамля, ці стаўленік Лукашэнкі. Казулін прайшоў праз калонію, мы не можам яго папракаць, бо ён прайшоў праз гэта сваім хрыбтом і галавой. Гэта ўнікальны чалавек, але ён не з жалеза», — зазначаў паэт, лідэр кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў.

### 2. Рэйтынг

**+** У Казуліна нараўне з Аляксандрам Мілінкевічам найбольшы рэйтынг сярод апазіцыйных палітыкаў. А пазнавальнасць яшчэ большая. Гэта і заслуга мінулай кампаніі, і памяць пра Казуліна як рэктара БДУ. Казуліну не давядзецца заваёўваць электарат з нуля, пэўная падтрымка ў яго маецца.

**–** Тым не менш, адмоўны рэйтынг у Казуліна таксама маецца. Найперш тут будуць чутныя галасы, што чалавека проста адагналі ад кармушкі. Таму ён прагне рэваншу і сышоў у апазіцыю. У свой час Казулін неаднаразова заяўляў, што з'яўляецца чалавекам прэзідэнта.

**Аляксандр Казулін**
Нарадзіўся 25 лістапада 1955 у Мінску. Прафесар, доктар навук, акадэмік Акадэміі адукацыі. Былы лідэр Беларускай сацыял–дэмакратычнай партыі (Грамада). Удзельнічаў у прэзідэнцкіх выбарах 2006. Паводле незалежных сацыёлагаў, набраў 6% галасоў. Удзельнічаў у паслявыбарчых акцыях пратэсту. 25 сакавіка 2006 арыштаваны за арганізацыю вулічнага шэсця. Асуджаны на 5,5 года зняволення. Пакаранне адбываў у калоніі Віцьба (Віцебскі раён). Вызвалены ў жніўні 2008 пад ціскам Еўрасаюза і ЗША. У лютым 2008 у Казуліна памерла жонка Ірына. Ад іхняга шлюбу засталіся дзве дачкі — Вольга і Юлія.

### 3. Аўтарытэт

**+** З турмы Казулін выйшаў бясспрэчным маральным аўтарытэтам. За гады зняволення і пасля смерці жонкі Казулін набыў вобраз пакутніка. Нават не схільны да кааліцый лідэр КХП-БНФ Зянон Пазняк і той садзіўся за стол перамоваў з Казуліным перад самітам «Усходняга партнёрства». Дарэчы, калі Казулін толькі прыйшоў у апазіцыю, то не мог звязаць двух словаў на беларускай мове, а цяпер выдатна размаўляе на ёй.

**–** Тым не менш, некаторыя ўсё яшчэ помняць часы, калі Казулін быў рэктарам БДУ. Пры ім ва ўніверсітэце пачаліся першыя палітычна матываваныя выключэнні студэнтаў. Частка выкладчыкаў праз сваю актыўную грамадзянскую пазіцыю таксама была вымушаная шукаць новую працу. Пры Казуліну русіфікацыя ўніверсітэта таксама набірала максімальныя памеры.

### 4. Адміністратар

**+** Аляксандр Казулін заслужыў сабе славу таленавітага і здольнага адміністратара. БДУ пры ім дасягнула найбольшага росквіту. Будаваліся новыя карпусы, інтэрнаты. Сам Казулін у той час быў прыроўнены да ўзроўню міністра. Казулін і тады не адмаўляў сабе ў эпатажы. Напрыклад, аднойчы 1 верасня рэктар з'явіўся да студэнтаў на верталёце.

**–** У апазіцыі менеджэрскія і адміністратарскія здольнасці Казуліна расцвісці не змаглі. Мыльнымі бурбалкамі аказаліся ягоныя ініцыятывы «Воля народу» і «Беларускі дом». У Сацыял-дэмакратычнай партыі Казулін таксама надоўга не затрымаўся.

### 5. Падтрымка

**+** Казулін не выклікае прынцыповага пярэчання ў большасці апазіцыйных кандыдатаў. Калі механізм абрання адзінага ўсё ж запрацуе, то палітык мае шанцы ўзначаліць калону. Тым больш, што Казулін мае непасрэднае дачыненне да Рады інтэлігенцыі, якая і хоча ўзначаліць працэдуру вылучэння адзінага.

**–** З мінулай прэзідэнцкай кампаніі нават самыя блізкія паплечнікі кандыдата Казуліна разбегліся ад яго, як толькі скончыліся грошы. На сёння ў значнай ступені прафесар — палітык-адзіночка. Калі, вядома, за ім не стаіць трохі таямнічая кампанія «Гавары праўду».

**Зміцер Панкавец**

## Аляксандр Казулін гатовы вучыцца на памылках

У інтэрв'ю «Салідарнасці» экс–кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін распавёў, чаму зноў ідзе на выбары.

**— Што вам дае надзею думаць, што гэтыя выбары будуць адрозніванца ад папярэдніх? Ці Вы самі маеце намер дзейнічаць інакш?**

— Калі не рабіць высноваў з папярэдніх памылак, наўрад ці варта наступаць на тыя ж граблі. У мяне ёсць уласны досвед, веды і разуменне таго, што было, што ёсць і што будзе. Я магу дастаткова ясна прапаноўваць розныя шляхі развязання сітуацыі.

**— Вы казалі пра памылкі. І што ж вы лічыце сваёй галоўнай памылкай у папярэдняй кампаніі?**

— Пытанне заключаецца ў тым, што любы досвед каштуе значна даражэй, чым любыя памылкі. Бо пакуль ты не прапусціш праз самога сябе, цяжка да канца ўсё зразумець. Таму трэба ўсведамляць, што вопыт — гэта веданне, а веданне — гэта магчымасць прымаць правільныя рашэнні.

**— Ходзяць чуткі, што на выбары вы ідзяце ў звязцы з Аляксандрам Ярашуком. Ці так гэта?**

— Гатовы выступіць у звязцы з любым, калі ў нас будзе магчымасць знайсці кампраміс і кансэнсус. І калі мы не зможам дасягнуць кансалідацыі і адзінства, то ўсё астатняе — гэта ўжо гульня ў якасці дэкарацыі.

**«Салідарнасць»**

## «Newsweek»: Крэмль падтрымае Саннікава

Сенсацыйную заяву зрабіў амерыканскі часопіс «Newsweek»: Крэмль вызначыўся, якога кандыдата будзе падтрымліваць на прэзідэнцкіх выбарах у Беларусі.

Праз пяць гадоў пасля «каляровых» рэвалюцыяў, якія ахапілі краіны былога СССР, у Крамля, нарэшце, з'явіўся шанец узяць рэванш, піша «Newsweek».

Магчыма, па хуткім часе расійскія ўлады здолеюць зрынуць яшчэ двух кіраўнікоў суседніх дзяржаваў — Міхаіла Саакашвілі і Аляксандра Лукашэнку, не выключаюць журналісты.

У Беларусі Крэмль знайшоў свайго чалавека, піша выданне, —мясцовага апазіцыянера Андрэя Саннікава. Паводле ацэнкі часопіса, ён не занадта блізкі з Захадам і гатовы прыняць дапамогу Расіі. Па словах самога Саннікава, Лукашэнка «ў апошні час страшэнна напалоханы пасля таго, як стаў сведкам таго, як Расія падтрымлівае змену ўлады ў былых савецкіх краінах».

Саннікаў успрыняў гэтую інфармацыю часопіса як чаканую. Прынамсі, здзіўлення з яго боку не было. «З Расіяй даўно час выбудоўваць нармальныя адносіны. Расійская Федэрацыя заўсёды будзе стратэгічным партнёрам Беларусі. Калі Масква ўспрымае мае галоўныя мэты — свабодная Беларусь у 2011 годзе і Беларусь у Еўрасаюзе ў 2016—2017 гадах, — дык можна размаўляць па ўсіх пытаннях, якія хвалююць і нас, і Расію. У гэтым нічога немагчымага няма. Мадэллю такіх адносінаў з'яўляецца Украіна», — заявіў палітык.

Цяжка верыцца ў тое, што Крэмль на выбарах сапраўды можа падтрымаць Саннікава. Хутчэй за ўсё, гэтая навіна сыходзіла ад самога палітыка ці ад ягоных канкурэнтаў. Аднак Саннікаў скарыстаўся з яе, каб разрэкламаваць сябе і прадэманстраваць сваю гатоўнасць абаперціся на расійскую падтрымку.

Збоку гэта выглядала як выдатны піяр-крок. Імя Саннікава ўспомнілі дзясяткі выданняў як унутры Беларусі, так і за яе межамі.

Паводле інфармацыі «НН», «Newsweek» здабыў гэтую інфармацыю з кола «Новай газеты». Карэспандэнтам гэтага выдання ў Беларусі працуе Ірына Халіп — жонка Андрэя Саннікава.

**ЗП**

## Новы пасол Германіі

Ці будзе новы пасол працягваць курс Вайса на будаванне асабістага даверу з Лукашэнкам?

Канчаецца тэрмін працы пасла Гебхарта Вайса. Ён мае пакінуць працу ў Мінску.

Афіцыйна імя новага пасла пакуль не называецца. Але нефармальна вядома, што ім стане Крыстаф Вайль. Вайль — кадравы дыпламат, з досведам працы ў Маскве і Цэнтральнай Азіі.

Усіх цікавіць, ці будзе новы пасол працягваць курс Вайса на будаванне асаблівага асабістага даверу з Лукашэнкам і ягонымі найбліжэйшымі дарадцамі. Многія ў грамадзянскай супольнасці Нямеччыны асуджалі такую палітыку, як і ігнараванне Вайсам беларускай апазіцыі.

**Мікола Бугай**

### Сцісла

• **Кіраўнікі МЗС краінаў Усходняга партнёрства сустрэнуцца ў Польшчы.** Сустрэча адбудзецца 24 мая ў польскім Сопаце. Беларусь будзе прадстаўляць Сяргей Мартынаў. Міністры абмяркуюць перспектывы сумеснай працы ў межах праграмы «Усходняе партнёрства».

• **Прыязджаў прэзідэнт В'етнама.** Нгуен Мінь Чыет знаходзіўся ў Мінску ад 12 да 15 мая. Падчас перамоваў з Лукашэнкам было вырашана, што кіраўнік Беларусі бліжэйшым часам зробіць візіт у адказ.

• **Ад Партыі БНФ кандыдатам у прэзідэнты будзе Рыгор Кастусёў?** Старшыня партыі Аляксей Янукевіч агучыў імя чалавека, які, на яго думку, найбольш адпавядае крытэрыям кандыдата ў прэзідэнты, — гэта Рыгор Кастусёў. Ён сам з Магілёўшчыны, скончыў сельскагаспадарчую акадэмію. Працаваў у Шклове кіраўніком раённай сістэмы камунальнай гаспадаркі. Быў дэпутатам, а таксама старшынёй калгаса.

• **Пасол Кыргызстана ў Беларусі Ішэнкуль Балджурава часова адклiканая ў Бішкек.** 13 мая супрацоўнікі беларускага пасольства ў Кыргызстане пакінулі гэтую краіну з меркаванняў бяспекі. Выехаў і беларускі пасол.

**ЗП**

# Дырэктыва Лукашэнкі №4:
## прыватызацыя 75% актываў, зніжэнне падаткаў

Пакуль гэта толькі піяр–зліў. Але характэрны.

У інтэрнэце апублікаваны меркаваны праект новай дырэктывы кіраўніка дзяржавы. Праўда гэта ці фальшыўка — хутчэй другое, але да стратэгіі варта прыгледзецца.

Вось ужо шэсць гадоў дырэктывы ў Беларусі выступаюць своеасаблівымі праграмнымі дакументамі. Іх нявызначаны прававы статус — і не ўказ, і не закон — не перашкаджае ім прымацца да выканання ўсёй краінай. Гэты факт толькі дадае сенсацыйнасці апублікаванаму дакументу. Такі дакумент здзейсніў бы сапраўдную рэвалюцыю ў беларускай эканоміцы.

Здаецца, аўтарства такой праграмы магло б належыць радыкальным лібералам накшталт Яраслава Раманчука, але ніяк не эканамістам Адміністрацыі прэзідэнта.

### Сем накірункаў лібералізацыі

Што ж прапануецца змяніць у заканадаўстве Беларусі да 1 верасня 2010 года, як пазначана ў дырэктыве?

Лібералізацыю мяркуецца правесці ў сямі накірунках.

Па-першае, амаль цалкам адмяніць рэгуляванне цэн. Выключэнне зроблена толькі для тарыфаў на ЖКГ, грамадскі транспарт, стацыянарную сувязь, дзяржаўную адукацыю і ахову здароўя. Цэны на імпартныя тавары і паслугі стануць цалкам свабоднымі, а аб'екты харчавання пазбавяцца нацэначных катэгорый. Усё вырашыць толькі попыт і прапанова.

Плануецца правесці міжнародны аўдыт выдаткаў на вытворчасць электрычнай, цеплавой энергіі, газу, паслуг грамадскага транспарту, водазабеспячэння, тэлефонных паслуг, апублікаваць дадзеныя аўдыту і прыняць план пераходу на бездатацыйны характар продажу дадзеных тавараў і паслуг.

Па-другое, ліцэнзаванне застанецца толькі ў тых сферах, дзе існуе непасрэдная пагроза жыццю і здароўю чалавека. Абавязковая сертыфікацыя тавараў і паслуг будзе заменена на добраахвотную, а да 2014 года ўсе ДАСТы будуць заменены на міжнародныя стандарты якасці ISO.

Наступны пункт датычыцца абароны правоў уласнасці. Прадугледжваецца стварэнне Антыманапольнага камітэта і інстытута прыватных судовых выканаўцаў, а таксама адмена манаполіі «Белтэлекама» на пропуск міжнароднага інтэрнэт-трафіку. Арандатары памяшканняў і будынкаў, што належаць мясцовай уладзе, могуць радасна паціраць далоні — да канца года ім прапануюць выкупіць арандаваныя памяшканні.

У гэтым жа падраздзеле прыведзены, бадай, самы гучны і амбіцыйны лозунг: «Да 2013 года, прынамсі, 75% усіх актываў краіны павінны знаходзіцца ў прыватнай уласнасці».

Да 2012 года павінна быць завершана прыватызацыя ўсіх аб'ектаў гандлю, грамадскага харчавання і побытавага абслугоўвання.

Пункт наконт рынку працы і працоўных адносін дае права ІП-шнікам наймаць да 5 працаўнікоў, а калі яны працуюць па агульнай схеме падаткаабкладання, то колькі заўгодна чалавек. Апрача таго ўказваецца, што абавязковасць ужывання Адзінай тарыфнай сеткі застанецца толькі для прадпрыемстваў з доляй дзяржавы большай за 50%, а дапамога па беспрацоўі павінна стаць эквівалентнай $120 у месяц.

Шосты раздзел памяншае стаўкі арэнднай платы за памяшканні, якія належаць мясцовым уладам, у два разы і ўводзіць мараторый на правядзенне ўсіх відаў праверак суб'ектаў малога бізнэсу да 1 студзеня 2013 года.

Нарэшце, сёмы пункт дырэктывы прынцыпова змяняе сістэму падаткаабкладання. Падатак на дададзеную вартасць рэзка падае з 20% да 15%, а адлічэнні ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва далучаюцца да падаходнага падатку (раней 12%). Выніковы адзіны сацыяльны падатак мае складаць 15%.

### Праўда ці няпраўда?

Калі з прыведзенага спіса рэформ была б ажыццёўлена хаця б трэціна, гэта было б пераломам у эканоміцы. Вось толькі ці можна даць веры дакументу? Выглядае на тое, што гэты «праект» быў зроблены наўмысна, але кім? Перадусім гэта падобна на спробу ўмацавання пазіцый Лукашэнкі. Маўляў, цярпіце мяне — і бізнэс будзе развівацца.

Эканаміст Аляксандр Чубрык мяркуе, што некалькі пунктаў дакладна сведчаць пра тое, што гэта праца рук Яраслава Раманчука. У першую чаргу тое, што датычыць рэформы падатковай сістэмы. «Відаць, гэта «вутка» — калі толькі ўлады не нанялі Яраслава ў адміністрацыю... Хаця было б някепска глянуць на «Беларусь пасля лібералізацыі», — жартуе Чубрык.

Яраслаў Раманчук у размове з карэспандэнтам «НН» выказаў задаволенасць, што праект дырэктывы перакліхаецца з ягонымі ідэямі. «Нехта зрабіў удалую кампіляцыю з праграм, прапанаваных бізнэс-супольнасцю, — ухіляецца ён ад адказу. — Я яшчэ не паспеў абмеркаваць гэты праект у кулуарах урада, але відавочна, што ён будзе мець шэраг праціўнікаў. У першую чаргу, гэта памочнік прэзідэнта Сяргей Ткачоў, а таксама міністэрствы прымысловасці і сельскай гаспадаркі». Яраслаў Раманчук настойвае, што не браў непасрэднага ўдзелу ў стварэнні праекта.

**Яўген Васількоў**

**Гісторыя лукашэнкаўскіх дырэктыў**

1 (2004) — пра ўмацаванне бяспекі і дысцыпліну

2 (2006) — пра дэбюракратызацыю дзяржаўнага апарата

3 (2007) — пра эканомію і ашчаднасць

# Зямлю пад гатэль «Кемпінскі» ў цэнтры Мінска аддалі бясплатна



Указ прэзідэнта прадугледжвае беспрэцэдэнтныя падатковыя зніжкі для забудоўшчыка.

Элітны гатэль «Кемпінскі» мае з'явіцца каля будынка цырка ў Мінску да канца 2013 года. Адпаведны ўказ № 243 падпісаны 11 мая кіраўніком дзяржавы.

Праектаванне і будаўніцтва комплексу будзе ажыццяўляць САА «Эліт Эстэйт» за кошт уласных сродкаў. А вось пляц паміж праспектам Незалежнасці, вуліцай Янкі Купалы і Свіслаччу здаецца заказчыку «ў арэнду без правядзення аўкцыёна і без збірання платы за заключэнне дамовы арэнды».

Апроч таго, «Эліт Эстэйт» вызваляецца ад аплаты мытаў і ПДВ пры ўвозе тавараў для праектавання, будаўніцтва і абсталявання комплексу, збораў у бюджэт Мінска і адлічэнняў у фонд прэзідэнта.

Каб спрасціць працэдуру прыцягнення на будоўлю гастарбайтэраў, рашэнні аб выдачы спецдазволаў на права працы ў Беларусі будуць выдавацца на працягу 2—7 дзён.

«Эліт-Эстэйт» — кампанія, створаная пры маскоўскай мэрыі. Усе ранейшыя праекты рэалізоўваліся ў Маскве і Падмаскоўі.

Гэта далёка не першая сітуацыя з сумнеўнымі дамоўленасцямі з замежнымі інвестарамі. Найбольшы розгалас выклікала здзелка з Аманам, калі 65 тысяч квадратных метраў у самым цэнтры горада былі прададзеныя за $10 мільёнаў.

**ЯВ**

# Новыя кватэры даражаюць, а старыя — таннеюць

Мінскія навабуды перагналі па цэнах другасны рынак жылля.

Нацыянальнае кадастравае агенцтва вядзе падлік усіх заключаных здзелак з кватэрамі. На працягу апошняга месяца было зарэгістравана 420 пакупак. Калі адкінуць зусім нерэалістычныя цэны — накшталт двухпакаёўкі па $240 за метр, — выходзіць, што сярэдняя цана квадратнага метра кватэры на другасным рынку жылля складае $1295.

Пры гэтым кватэры патроху таннеюць. У пачатку года адпаведны паказчык складаў $1315.

Сярэдняя цана прапановы на другасным рынку большая прыблізна на $100 за кожны метр, але ў выніку торгу цана змяншаецца.

А вось сярэдні кошт квадратнага метра ў навабудах, паводле падлікаў сайта realt.by, дасягнуў $1301.

З пачатку года рост цэн склаў 4,3%, бо ў студзені цана складала $1243.

**ЯВ**

# Паліва падаражала ў трэці раз

З пачатку года цэны ўзраслі больш чым на 15%, і абураныя кіроўцы рыхтуюцца да пратэсту.

| | АІ-92 | АІ-95 | Дызель | Біядызель |
|---|---|---|---|---|
| **22 студзеня** | 2470 | 2780 | 2220 | 1910 |
| **12 траўня** | 2870 | 3240 | 2580 | 2220 |

23 студзеня, 27 лютага і 12 мая — даты трох падаражанняў бензіна і дызельнага паліва ў Беларусі. Рост цэн склаў 2%, 7% і 6% адпаведна.

Перагляд цэнаў на нафтапрадукты тлумачыцца ростам цаны на біязмытную нафту, якая пастаўляецца на беларускія НПЗ з Расіі.

Кіроўцаў, абураных чарговым падаражаннем, такі аргумент не задавальняе. Яны ініцыююць пратэстную акцыю «Стоп бензін!» «Усім кіроўцам Беларусі прапануецца ад 1 да 4 чэрвеня па магчымасці не карыстацца ўласным аўто, але галоўнае — не заязджаць на аўтазапраўкі 4 чэрвеня», — кажуць каардынатары акцыі. Днямі будуць распаўсюджаныя налепкі з заклікам.

**ЯВ**

## Сцісла

• **Еўрааблігацыі на $2 мільярды.** Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка даў права ўраду выпусціць еўрааблігацыі ў гэтым і наступным годзе. Арганізатарамі выпуску беларускіх еўрабондаў стануць «Сбербанк» Расіі, Deutsche Bank, RBS і BNP Paribas.

• **Ліміт замежнага доўгу — $11 мільярдаў.** Ранейшы ліміт складаў $9,5 мільярда. Цяпер ён павялічаны прэзідэнцкім указам. Гэта дазволіць запазычаць на замежных рынках і ў міжнародных фінансавых арганізацый пад дзяржаўныя гарантыі парадку $2,5 млрд. Указ быў падпісаны на другі дзень працы чарговай місіі МВФ у Мінску.

• **Аўтамат па продажы залатых зліткаў.** Яго ўсталявалі ў адным з люксавых гатэляў Абу-Дабі, сталіцы Арабскіх Эміратаў. Апарат пад назвай «Золата з сабой» сам пакрыты золатам і выдае зліткі вагой 1 г, 5 г, 10 г і адну унцыю (31,1 г). Да аплаты прымаюцца як купюры, так і крэдытныя пластыкавыя карткі.

• **Беларусь прыпыніла пастаўкі сухога малака ў Расію.** Гэта зроблена па просьбе расійскага боку на перыяд «вялікага малака». У будучыні вырашана стварыць беларуска-расійскі саюз вытворцаў і перапрацоўшчыкаў малака.

• **Татарстан адкрые ў Беларусі 38 АЗС.** Іх будаўніцтва ўжо вядзецца. У будучыні колькасць заправак «Татнафты» давядуць да ста. Пра гэта прэм'ер Сяргей Сідорскі дамовіўся з прэзідэнтам Татарстана.

• **На чыгунцы ў Латвію.** Беларуская чыгунка плануе арганізаваць у наступным годзе сувязь між Мінскам і Рыгай.

• **У Вялікабрытаніі забаранілі банкноты ў 500 еўра.** Улады краіны прыйшлі да высновы, што многія такія банкноты фальшывыя або выкарыстоўваюцца злачынцамі. Па некаторых ацэнках, дзевяць з дзесяці такіх купюр падрабляюць. У крымінальным свеце купюры ў 500 еўра атрымалі мянушку «Бен Ладэн»: усе ведаюць, як павінны выглядаць гэтыя грашовыя знакі, аднак сапраўдных ніхто не бачыў.

**ЯВ**



# Калі б не Мюлер!

Зборная Беларусі па хакеі пад кіраўніцтвам Эдуарда Занкаўца не змагла трапіць у чвэрцьфінал чэмпіянату свету.



Для гэтага зборнай трэ было перамагчы некага з фаварытаў. Бліжэй за ўсё да перамогі беларусы былі ў гульні са славакамі. Пасля першага перыяду нашы выйгравалі 2:0. Але ў другой і трэцяй частках гульні новая каманда Глена Хэнлана закінула чатыры безадказныя шайбы.

Цікава было ў той гульні назіраць за паводзінамі настаўнікаў. Хэнлан у сваёй манеры заводзіў хакеістаў, нешта маляваў на планшэце, размахваў рукамі. На яго твары адлюстроўвалася ўся гама эмоцый, што віравалі на пляцоўцы. Занкавец жа назіраў за матчам з каменным тварам. Патрэбных словаў для хакеістаў у пераломныя моманты ён так і не знайшоў.

Шанец выйсці ў плэй-оф заставаўся ў выпадку перамогі над немцамі. І на працягу 50 хвілін беларусы гераічнымі намаганнямі Мезіна і кампаніі ўтрымлівалі мінімальную перавагу ў ліку. Для перамогі ў асноўны час не хапіла 54 секунд. Хакеіст з тыповым нямецкім прозвішам Мюлер, якога выпусцілі на поле замест брамніка, пахаваў надзеі беларусаў, зраўняўшы лік. У овертайме Калюжны вырваў перамогу, але радасці яна нікому не прынесла: для выхаду ў плэй-оф трэба выйграваць у асноўны час.

Сапраўдным жа адкрыццём чэмпіянату стала зборная Даніі. Скандынавы па чарзе адужалі фінаў, амерыканцаў і славакаў. У вочным супрацьстаянні з беларусамі датчане прайгралі, але той матч для іх ужо нічога не значыў.

Вынікі Даніі паказваюць, што поспехаў можна дасягаць і без сумнеўнага ўдзелу ў Кантынентальнай хакейнай лізе, а таксама без гучных заяваў пра развіццё хакея.

Яшчэ ўражанне ад чэмпіянату: здавалася, што каманды між сабой гуляюць у паддаўкі. То спачатку швейцарцы сенсацыйна выйграюць у канадцаў, то потым не менш сенсацыйна прайграюць нарвежцам.

Хіба адзіная зборная, нацэленая на золата, — расійская. Яна пакуль не прайгравала нікому. Тым не менш, знаходжанне расіян у Германіі таксама азмрочана скандалам. Адзін з расійскіх тэлеканалаў паказаў ролік, дзе гульцы зборнай паляць цыгарэты на выхадзе з кёльнскага рэстарана. Хакеісты пакрыўдзіліся і перасталі кантактаваць з прэсай.

А расійскі трэнер Вячаслаў Быкаў, калі нехта з журналістаў пачаў апеляваць да яго патрыятызму, заявіў: «Нас Радзіма нават у жывым эфіры не паказвае».

**Зміцер Панкавец**

## Прычына смерці беларускага студэнта ў Гданьску пакуль невядомая

У польскім Гданьску знойдзены нежывым беларускі студэнт Канстанцін Жылінскі. Прычыны смерці пакуль невядомыя. Жылінскі навучаўся ў Гданьскім універсітэце ад 2006 года, вывучаў эканоміку.



Гэты ўраджэнец Рагачова быў прыязным, камунікабельным юнаком, добра сябраваў з калегамі. Напярэдадні ён пабываў у доктара, атрымаў медычную страхоўку для падаўжэння вучобы. Яшчэ ўранку ён паснедаў, а пасля яго знайшлі мёртвым у сваім пакоі.

**ЗП**

# Устаноўленыя аўтары нацысцкага банера на матчы «Дынама»

Мінскае «Дынама» ўстанавіла асоб, якія маюць дачыненне да нацысцкай выхадкі фанатаў на матчы чэмпіянату Беларусі супраць «Віцебска» 28 красавіка, паведаміў старшыня Беларускай федэрацыі футбола Генадзь Нявыглас 13 мая.

Паводле яго слоў, калі клуб прадставіць канкрэтныя доказы ўстанаўлення вінаватых, апеляцыйны камітэт БФФ можа або адмяніць, або паменшыць памер штрафу, накладзенага на «Дынама» дысцыплінарным камітэтам. На пасяджэнні 6 мая гэты камітэт прыняў рашэнне ахштрафаваць «Дынама» на 7 тыс. базавых велічынь — 245 млн рублёў, ці 82 тыс. даляраў ЗША. «Дынама» выказала нязгоду з вердыктам і падало апеляцыю.

Міліцыя вядзе расследаванне абставінаў здарэння, адзначыў кіраўнік БФФ. «Не ведаю, ці будзе гэта крымінальны працэс, але вінаватыя пакаранне панясуць», — заявіў ён. «Усе ацэнкі гэтаму агіднаму факту ўжо прагучалі. Напярэдадні свята гэтая выхадка выглядае яшчэ больш блюзнерскай», — сказаў Нявыглас.

На матчы «Дынама» — «Віцебск» у сектары фанатаў каманды гаспадароў быў вывешаны банер, які праслаўляў аднаго з нацысцкіх ваенных злачынцаў Рудольфа Геса.

**Дзмітрый Уласаў, БелаПАН**




## Не плаціш за кватэру — высяляйся

Закон стане стражэйшым да неплацельшчыкаў. Затое спросціцца іпатэка.

Праект новага Жыллёвага кодэкса паступіў на разгляд у парламент. Асноўныя змены датычацца іпатэкі і новых магчымасцяў высялення жыльцоў.

Уласнікі памяшкання змогуць высяляць паўналетніх членаў сям'і, якія не маюць долі ў праве на ўласнасць, без прадастаўлення жылых памяшканняў. Напрыклад, муж-уласнік зможа прымусіць былую жонку з'ехаць з яго кватэры. Калі, зразумела, яны не заключалі дадатковай дамовы.

Не заплаціўшы за кватэру тры месяцы, жыльцы патрапяць у рызыкоўны стан. Выканкамы атрымаюць права звяртацца ў суд і паводле яго рашэння забіраць памяшканне. Гэта ж датычыцца і выпадкаў, калі жыльцы робяць немагчымым пражыванне суседзяў.

Нарэшце, дзяржава робіць крок для ўмацавання пазіцый іпатэкі. Цяпер банкі змогуць высяліць тых, хто сістэматычна не вяртае грошай, атрыманых у крэдыт. Гэта дадасць банкаўскім структурам упэўненасці і дазволіць ім знізіць крэдытныя стаўкі.

**Яўген Васількоў**

# Сяргей Каваленка асуджаны на тры гады ўмоўна

Такі прысуд мужчыну, які вывесіў нацыянальны сцяг на навагодняй ёлцы ў Віцебску.

Яго вынес 14 мая суддзя Яўген Буруноў.

Актывіста КХП-БНФ вінавацілі ў злосным хуліганстве, а таксама непадпарадкаванні супрацоўнікам міліцыі. 7 студзеня Каваленка вывесіў вялізны бел-чырвона-белы сцяг на цэнтральнай ялінцы Віцебска. Тады Каваленку змясцілі ў ізалятар часовага ўтрымання, але праз некалькі дзён выпусцілі.

Сам Каваленка на судзе настойваў, што гэта была палітычная акцыя, а не хуліганка. Актывіст сем разоў рабіў адводы суддзі і пракурору, але іх увесь час адхілялі. Таксама Каваленка дабіўся перакладчыка з расійскай на беларускую.

Пракурор патрабаваў пакараць Каваленку трыма гадамі «хіміі», але суддзя вынес больш мяккі прысуд.

Яшчэ Каваленка мусіць сплаціць маральную кампенсацыю міліцыянтам Іванову і Палітыку — па мільёне, а таксама Максімаву — 1,5 мільёна.

«Мая акцыя мела рэзананс не толькі сярод апазіцыі і міліцыянераў, але і паміж звычайнымі грамадзянамі. Я выканаў сваю мэту, каб пра бел-чырвона-белы сцяг даведалася як мага больш людзей. Мне неаднаразова даводзілася бываць на судах. Гэта спроба прынізіць чалавека. На гэтым жа судзе я іх зрабіў», — кажа С.Каваленка.

Асуджаны збіраецца бліжэйшым часам абскардзіць прысуд. Змяншаць палітычную актыўнасць ён не збіраецца. «Яны гэтага і дабіваюцца, каб я супакоіўся на нейкі час, а потым мне адпомсціць. Калі я буду актыўны, то зрабіць гэта будзе цяжэй», — гаворыць мужчына.

Цікава, што 14 мая споўнілася 15 гадоў з дня правядзення рэферэндуму аб змяненні дзяржаўнай сімволікі.

**ЗП**

**БЕЛАРУСЬ—ЕС**

## Два дні Еўропы: як усё пачыналася

9 мая 1950 г. французскі міністр замежных справаў Рабэр Шуман прапанаваў заснаваць Еўрапейскае таварыства вугалю і сталі — усім вядома, што Еўрапейскі Саюз пачаўся з яго. За год да гэтай падзеі, 5 траўня 1949, была заснаваная Рада Еўропы. Гэтыя дзве даты вядомыя сёння як Дзень Еўропы.

Сімвалічна — менавіта вайсковая сыравіна робіцца інструментам аб'яднання Еўропы: супольнасць ствараюць краіны, якія раней ваявалі паміж сабой: Бельгія, Федэратыўная Рэспубліка Германія, Францыя, Італія, Люксембург і Нідэрланды. Мэта стварэння еўрапейскай супольнасці, таксама як і Рады Еўропы, — у забеспячэнні міру і згоды паміж еўрапейскімі нацыямі, як пераможцамі, так і пераможанымі ў Другой сусветнай вайне. Яшчэ натхнёны гуманістычнымі ідэямі Віктор Гюго марыў пра «Злучаныя Штаты Еўропы». Гэтую ідэю адраджае і лабіруе Уінстан Чэрчыль.

Але толькі ў ліпені 1968 дзяржавы Еўрапейскай эканамічнай супольнасці адмяняюць мытныя тарыфы і зборы. Гэтая дата дазваляе ўявіць, наколькі працяглы і выверааны ў часе шлях еўрапейскай інтэграцыі.

Еўрапейская супольнасць развіваецца настолькі паспяхова, што ў 1973 годзе да яе далучаюцца яшчэ тры дзяржавы: Данія, Ірландыя і Вялікабрытанія.

Аднак потым здараецца сусветны нафтавы крызіс 1973 і 1979 гадоў, калі шэраг еўрапейскіх краін выкарыстоўвае пратэкцыянісцкія меры. Гэта выпрабаванне для аб'яднанай Еўропы. Увядзенне супольнай валюты і ўтварэнне адзінага рынку расцягваецца на дзесяцігоддзі.

У 1981 да супольнасці далучаецца Грэцыя, а ў 1986 — Іспанія і Партугалія. З таго часу ў аб'яднанай Еўропы новая найважнейшая эканамічная задача — пераадоленне эканамічнага разрыву паміж 12 краінамі.

### Як увайсці ў Еўрапейскі Саюз і Раду Еўропы?

Беларусь не з'яўляецца сябрам Рады Еўропы. Нашая краіна не мае нават статусу спецыяльнага госця ў гэтай арганізацыі, бо да гэтага часу не наважваецца ўвесці мараторый на смяротнае пакаранне. І гэта адзінае выключэнне ў еўрапейскай сям'і.

Каб стаць сябрам Еўрасаюза, недастаткова проста жадання ўрада. 17 гадоў таму еўрапейскія лідэры ўсталявалі крытэры, якім мусяць адпавядаць краіны, што жадаюць уступіць у ЕС.

Гэта, па-першае, палітычны крытэр: у краіне-кандыдатцы павінныя быць стабільныя дэмакратычныя інстытуты, верхавенства права, павага да правоў чалавека і меншасцяў.

Па-другое, эканамічны крытэр: функцыянальная рынкавая эканоміка, якая дазваляе краіне спраўляцца з канкурэнтным прэсам унутры Еўрасаюза.

І, нарэшце, крытэр здольнасці выконваць свае абавязальніцтвы. Амаль 30 тысяч заканадаўчых актаў Еўрасаюза павінныя быць укаранёныя ў нацыянальнае заканадаўства і, што асабліва важна, выкарыстоўвацца на практыцы.

### Эканамічны гігант, але палітычны карлік?

Новыя геапалітычныя ўмовы дазволілі Аўстрыі, Фінляндыі і Швецыі далучыцца да ЕС з 1 студзеня 1995. Да гэтага часу ЕС аб'ядноўваў 15 краін і быў гатовы да замены нацыянальных валютаў адзінай еўрапейскай. Увядзенне еўра ў пачатку 2002 стала ўнікальным прэцэдэнтам у сусветнай гісторыі.

Чарговае пашырэнне ЕС адбылося ў 2004 годзе — туды ўвайшлі адразу 10 дзяржаваў, тры з якіх — суседзі Беларусі. За Літвой, Латвіяй, Польшчай, Кіпрам, Чэхіяй, Эстоніяй, Венгрыяй, Мальтай, Славакіяй і Славеніяй у 2007 годзе ў ЕС увайшлі Румынія і Балгарыя.

Сёння на парозе Еўрасаюза стаяць Македонія, Харватыя і Турцыя. Яшчэ шэраг балканскіх краін і Ісландыя падалі заяўкі на ўступленне. Уступіць у Еўрасаюз плануе Украіна.

Беларусь пакуль убаку ад еўрапейскага праекта. Хоць дынаміка эканамічных адносінаў краіны з аб'яднанай Еўропай вельмі пераканаўчая.

**Андрэй Елісееў**



PHOTO.BYMEDIA.NET

Пад'ехала міліцыя, і дэманстранты кінуліся наўцёкі.

# Гей-прайд-Мінск жорстка разагналі

**«Настроены на мясілава заднепрывадных»**

«Прызнаюся шчыра — АМАПаўцы раз'юшаны і настроены на мясілава заднепрывадных асабліва агрэсіўна. Таму трымайцеся трохі далей… Кроплі крыві запырскаюць фоцік, кавалкі мяса і гм… чагосьці яшчэ…» — папярэджваў міліцыянер, які вядзе мікраблог ГУУС на твітэры. Праз некалькі гадзін гэтыя допісы былі выдаленыя. Відаць, міліцыянты ўзгадалі, што дэманстранты такія грамадзяне Беларусі, як і ўсе астатнія. І маюць уласцівыя кожнаму чалавеку гонар і годнасць. Якая б ні была іх сэксуальная арыентацыя.

Мерапрыемства мусіла пачацца каля 13.00. На вуліцы Сурганава сабраліся журналісты, непадалёк дзяжурылі ДАІ і «людзі ў чорным» з рацыямі. Журналісты цярпліва чакалі: усім было сказана, што гэта толькі месца збору для СМІ, дзе пройдзе сам гей-прайд — нам паведамяць дадаткова.

Дадатковай інфармацыі пяцьдзясят журналістаў цярпліва чакалі. Урыўкамі з тэлефонных размоваў арганізатары паведамлялі, што ў іх праблемы, сутычка з контрманіфестантамі, запланаваны маршрут ачэплены, паўсюль аўтазакі... Журналісты, якія прыйшлі на мерапрыемства, першапачаткова былі далёка не гамафобна настроеныя. Аднак праз паўтары гадзіны чакання пачынала нарастаць непрыязь і жарты выходзілі далёка за межы цярпімасці да сэкс-меншыняў.

А палове на трэцюю міма праехалі байкеры з вясёлкавым сцягам. Супрацоўнікі ДАІ заўважна напружыліся. Журналістам паведамілі, што праз хвілін пятнаццаць маніфестанты нарэшце прыйдуць на вуліцу Сурганава.

Калі на даляглядзе стаў бачны вясёлкавы сцяг, журналісты пабеглі насустрач геям, лесбіянкам і транссэксуалам. Гэта была спроба трапіць да дэманстрантаў хутчэй за спецназ ці міліцыю.

Удзельнікаў шэсця было каля трыццаці, яны неслі пятнаццаціметровы сцяг і выкрыквалі: «Гамафобія — гэта хвароба». Яны падышлі да Інстытута мастацтвазнаўства і разгарнулі плакаты.

«Мы патрабуем дазволіць аднаполыя шлюбы! — выгуквалі ўдзельнікі гей-прайда. — Мы патрабуем абароны ад гамафобіі і жорсткасці, з якой сутыкаемся ў нашай краіне!»

Хлопцы і дзяўчаты моцна хваляваліся і азіраліся па баках. Не дарма: праз пару хвілін пад'ехала машына, выскачылі некалькі міліцыянтаў і вырвалі з рук у дэманстрантаў сцяг. Пачаліся крыкі, мітусня. Пасля пад'ехала яшчэ адна машына і пачалі затрымліваць. Журналістаў не кранalі: міліцыя прафесійна вырывала з натоўпу маладых людзей нетрадыцыйнай арыентацыі, у першую чаргу тых, хто спрабаваў даваць інтэрв'ю на камеры ці даставаць вясёлкавыя сцягі. Некаторых удзельнікаў занеслі ў аўтобус на руках.

За пятнаццаць хвілін усё было скончана.

На месцы падзеі быў заўважаны і адзін контрманіфестант. Спачатку ніхто моцна не звяртаў увагі на журналіста агенцтва БелаПАН Васіля Сямашку. Пасля некалькіх яго нецэнзурных выкрыкаў усе камеры павярнуліся да калегі. Той стаяў з дзясяткам яек і збіраўся іх кідаць у вясёлкавы сцяг. Аказалася, у яго сёння выходны і ён на месцы падзеяў не як журналіст, а выйшаў выказаць сваю грамадзянскую пазіцыю — пратэставаць супраць дэманстрацыі «ненармальных» арыентацый.

Праз пятнаццаць хвілінаў на Сурганава засталіся зноў толькі журналісты. Удзельнікі «Славянскага гей-прайда-2010» былі затрыманыя і разагнаныя. Васьмярых затрыманых ЛГБТ-актывістаў адвезлі на Акрэсціна, сярод іх двое грамадзян Расіі. Астатніх затрыманых адпусцілі.

17 мая Першамайскі раённы суд Мінска прызнаў іх вінаватымі ў несанкцыянаванай вулічнай акцыі. Усе яны атрымалі мінімальныя штрафы — па 17,5 тысячы рублёў.

Нагадаем, Мінгарвыканкам быў адмовіў арганізатарам «Славянскага гей-прайда-2010» у шэсці па вуліцах Мінска.

**Наста Шамрэй**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

«Дазволіць аднаполыя шлюбы!» — выгуквалі хлопцы і дзяўчаты.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Контрманіфестант прынёс з сабой яйкі.

## Здарэнні

• **Семінарыст краў грошы на казіно і прастытутак.** 22-гадовы беларуса, навучэнца адной з расійскіх духоўных семінарый, затрымалі па падазрэнні ў крадзяжы ў цягніку ў 40-гадовага жыхара Масквы. Да моманту затрымання будучы святар частку скрадзеных 210 тыс. расійскіх рублёў паспеў патраціць на прастытутак, казіно і дарагія мабільныя тэлефоны.

• **У Брэсце апаганены помнік вязням гета.** Невядомыя ў ноч з 9 на 10 мая спалілі ўсе вянкі і кошыкі з кветкамі ля манумента. Помнік устаноўлены ў памяць аб 34 тысячах забітых у гады вайны яўрэях, якія жылі ў Брэсце і наваколлях.

• **Як маладзечанцы самагонку баранілі ад міліцыі.** Дзесяць гадоў зняволення на трох атрымалі бацька і два ягоныя сыны, жыхары вёскі Вязавец, якіх суд прызнаў вінаватымі ў збіцці пяці мінскіх міліцыянтаў. Міліцыя атрымала інфармацыю, што бацька з сынамі займаюцца самагонаварэннем. Самагонку прадаюць. Калі міліцыянеры знайшлі самагонны аппарат, гаспадар пачаў нецэнзурна лаяцца і біць супрацоўніка міліцыі. Сыны ж увогуле пагналі праваахоўнікаў з двара калом і касой. Каб утаймаваць нападнікаў, мінскім міліцыянерам прыйшлося выклікаць падмогу з Маладзечна... Бацька і сыны Вірынскія на судзе казалі, што баранілі сваю маёмасць ад незнаёмцаў, з якіх ніхто, з іх словаў, не быў апрануты ў міліцэйскую форму. А самагонку яны не гоняць, брагу заводзяць, каб карміць скаціну.

• **У Полацку пярун забіў мужчыну.** 53-гадовы непрацуючы жыхар Полацка загінуў вечарам 12 мая на чыгуначнай станцыі. У час дажджу яны з сябрам стаялі пад дрэвам. Туды ўдарыла маланка. Другі мужчына, таксама 53-гадовы, з дыягназам «тэрмічны апёк правага вуха» змешчаны ў аддзяленне рэанімацыі.

• **Пабілі, разулі, абрабавалі.** У Астраўцы (Гродзенская вобласць) уначы абрабавалі 23-гадовага мужчыну. Знялі туфлі, акуляры, дзягу і забралі мабільны тэлефон. Рабаўнікоў затрымалі. Імі аказаліся два 21-гадовыя мясцовыя жыхары.

• **На ждановіцкім рынку канфіскавана партыя парнаграфіі.** Падчас затрымання прадаўца і гаспадара гандлёвага пункта канфіскавана 1067 дыскаў. Падчас вобшуку па месцы жыхарства была знойдзена камп'ютарная тэхніка, на якой, як мяркуюць міліцыянеры, і памнажалася парнаграфічная прадукцыя.

• **На МКАД загінуў раварыст.** 34-гадовы мужчына на аўтамабілі «Крайслер Таун Кантры», рухаючыся па МКАД з боку Лошыцы ў кірунку Шабаноў, наехаў на мужчыну 1941 года нараджэння, які перасякаў кальцавую на ровары. Ад атрыманых траўмаў раварыст памёр на месцы.

# Аляксандр Зімоўскі абмаляваў сцэнар адхілення Лукашэнкі ад улады

Ці дажыве Беларусь сінявокая™ да 2011 года?

Разгледзім нейкі не вельмі фантастычны варыянт развіцця падзей. Натуральна, з папраўкай на будучую палітычную кампанію.

Агульны ўнутраны фон: рэзкае пагаршэнне эканамічных умоў, рэальная інфляцыя ў першым паўгоддзі большая за 16%, рэгулярна даражэюць прадукты харчавання, бензін, паслугі ЖКГ, павялічваюцца мытныя пошліны і акцызы, рэзка падаюць даходы ад традыцыйных артыкулаў экспарту. Зніжэнне рэальных даходаў абумоўлена таксама масавым пераводам работнікаў на скарочаны працоўны дзень або адпраўленнем у неаплатныя адпачынкі, замарожваннем і / або зніжэннем заробкаў у дзяржсектары.

Агульны міжнародны фон: скачкападобны рост замежных запазычанняў, усё больш ціск краін-крэдытораў, недавер да ўрада з боку інвестараў, патрабаванні звонку цалкам перагледзець асноўныя прынцыпы ўнутранай палітыкі, г.зн. скараціць дзяржаўныя выдаткі, правесці прыватызацыю ў шэрагу галін, зрэзаць сацыяльныя праграмы, павялічыць пенсійны ўзрост. Плюс фактычны разрыў з галоўнымі саюзнікамі і спонсарамі.

Песімістычны сцэнар: улады ідуць на жорсткія стабілізацыйныя меры, у адказ пачынаюцца лакальныя акцыі пратэсту, якія, па магчымасці, спыняюцца сіламі аховы парадку. Прафсаюзы вагаюцца і не могуць доўга ўтрымліваць работнікаў ад забастовак, спачатку пад эканамічнымі, а потым і палітычнымі лозунгамі. Першай ластаўкай становіцца ўсеагульны 24-гадзінны страйк, які паралізуе большую частку краіны, зачыняюцца дзяржаўныя ўстановы, спыняецца рух самалётаў, цягнікоў і аўтатранспарта.

Фактар медыя: яшчэ да пачатку агульнанацыянальнай палітычнай кампаніі СМІ суседніх дзяржаў пачынаюць узгоднена і незычліва асвятляць падзеі, якія ў нас адбываюцца. Усё большы паток крытычнай інфармацыі не можа застацца без увагі. Цікаўнасць і скандальнасць, не ў апошнюю чаргу, забяспечваюцца масіраваным злівам кампрамату на вышэйшых службовых асобаў. У чацвёртым квартале (кастрычнік) у СМІ адбываецца ўцечка інфармацыі аб аднаўленні «газавай вайны», тэма дамінуе у агульнанацыянальнай выбарчай кампаніі.

Еўропа выказвае заклапочанасць. Суседзі Беларусі сінявокай™, якія перажываюць рэнесанс узаемаадносін, заяўляюць, што ў прымежных ПСГ дастаткова газу, каб забяспечыць своечасовыя пастаўкі на ўзроўні наяўных дамоўленасцяў, аж да пачатку эксплуатацыі магістралі «Паўночны паток». Еўропа вітае дальнабачнасць РАТ «Газпром»™.

Увaходзіць «далёкі ад апазіцыі» кандыдат-папуліст пад лозунгамі «Я вярну цяпло і грошы ў вашыя дамы», «Беларусь — краіна, адкрытая свету», «Нам няма чаго дзяліць з суседзямі» і г.д. Раскрутка кандыдата-папуліста ў інтэрнэце і па мабільнай сувязі (сацыяльныя сеткі, нерэгістраваныя ў Беларусі рэсурсы, бла-бла-бла), спадарожнікавае тэлевяшчанне, «сарафаннае» радыё. Кандыдат-папуліст і члены яго каманды пад ціскам вуліцы выбіваюць сабе права ўдзельнічаць у перамовах па газе і транзіце. Пасля змрочнага (без грошай і ацяплення) Новага года, за два тыдні да выбараў прэса абвяшчае іх віноўнікамі поспеху.

Заслона.

Аптымістычны сцэнар: акурат над ім працую.

**Аляксандр Зімоўскі, naviny.by**

Старшыня Дзяржтэлерадыёкампаніі Аляксандр Зімоўскі вядзе правакатыўную калонку на незалежным сайце naviny.by. У ёй ён падае дзяржаўную палітыку ў пазітыўным святле, але нетрадыцыйнымі метадамі.

# Геапалітычны выбар па «гамбургскім рахунку»

Сацыёлагі: сёння беларусы гатовыя сябраваць ці з ЕС, ці з Расіяй толькі прагматычна. Піша **Віталь Сіліцкі**.

Лозунг «Беларусь у Еўропу» стаў папулярным у сярэдзіне 1990-х. Мэта ўступлення Беларусі ў ЕС пракралася ў праграмы палітыкаў на мяжы тысячагоддзя.

Апазіцыя імкнулася «асядлаць» гэтую ідэю. Меркавалі, яе ў іх ніколі не скрадзе Лукашэнка (як гэта сталася з незалежнасцю). Здавалася б, тут жалезная прывабнасць — Еўропа, акіян дабрабыту. Так, давядзецца крыху папрацаваць, каб туды ўвайсці, але раз ужо залезлі за перавал, там ужо, як той казаў, «усё схоплена» і для дзяцей, і для ўнукаў. На пытанне, ці падтрымліваюць яны ўступленне ў Еўрасаюз, тады адказвала «так» да 60% рэспандэнтаў.

Рэшткі такіх стэрэатыпаў засталіся ў мысленні апазіцыі і да сёння. А вось прывабнасць ЕС у масавай свядомасці зблякла. Колькасць «еўраэнтузіястаў» скарацілася амаль удвая. Пачала яна скарачацца з таго моманту, калі ў ЕС увайшлі цэнтральнаеўрапейскія краіны. Быль і казка разышліся.

Дык ці варта палітыкам гаварыць з народам пра Еўропу? Як паказала даследаванне, праведзенае BISS сумесна з лабараторыяй «Новак», любое замежнапалітычнае пытанне актуальнае для выбаршчыка толькі тым, наколькі яно вырашае тыя жыццёвыя праблемы, з якімі сутыкаецца выбаршчык. Гэты феномен можна назваць рацыяналізацыяй замежнапалітычнага мыслення. Яно ў беларускай грамадскай свядомасці «вынесена» з культурнай плоскасці і амаль цалкам знаходзіцца ў плоскасці рацыянальнага выбару грамадзяніна. Еўропа, Расія і г.д. — не экзістэнцыйныя метафізічныя мэты, а сродкі, якія спрыяюць вырашэнню эканамічных праблем.

У анкету было ўключанае наўпростае пытанне: «Што, на ваш погляд, мусіць быць галоўным падчас выбару саюзнікаў Беларусі?» Вынік: з вялізным адрывам перамагае адказ «наколькі гэта будзе спрыяць паляпшэнню эканамічнага становішча». Адзіная іншая прыкметная дамінанта — пытанні бяспекі, міру і стабільнасці. «Ідэалагічныя» меркаванні (пытанні дэмакратыі і правоў чалавека, захавання культуры і самабытнасці, захавання звыклага жыццёвага ладу, адраджэнне СССР і г.д.) рэдка набіралі 5—6% адказаў рэспандэнтаў.

Структура адказаў практычна нязменная сярод прыхільнікаў процілеглых замежнапалітычных альтэрнатываў. Прычым сярод «еўраэнтузіястаў» працэнт тых, хто галасуе «кашальком», найвышэйшы. Ледзь-ледзь на агульным фоне вылучаюцца толькі прыхільнікі «незалежнай Беларусі, якая не ўступае ні ў якія саюзы». Гэта, дарэчы, зусім не нацыяналісты, якія грэбліва ставяцца да разбэшчанай Еўропы, а прыхільнікі Лукашэнкі, запалоханыя «бурлівым морам» і перш за ўсё Расіяй, якія арыентуюцца выключна на беларускую ўладу як на абаронцу.

Менш за палову беларусаў чакае, што ўступленне ў ЕС прывядзе да павышэння іх жыццёвага ўзроўню, нашмат меншая доля чакае паляпшэння жыцця пенсіянераў, ключавога электаральнага блока ў Беларусі. Паляпшэння сітуацыі з правамі чалавека чакае таксама менш за палову рэспандэнтаў. Найбольш моцнае станоўчае чаканне — новыя перспектывы для моладзі.

А вось чаканне негатыўных наступстваў уступлення ў ЕС відавочна дамінуе, перш за ўсё чаканне росту цэнаў і «ўцечкі мазгоў». Што дзіўна, грамадства не згаджаецца з высновай прапаганды, што сяброўства ў ЕС прывядзе да масавага закрыцця прадпрыемстваў. У цэлым грамадскія чаканні малююць дастаткова адэкватную карціну будучыні, калі ўзгадаць досвед еўраінтэграцыі суседзяў Беларусі.

За ЕС выступае больш за 60% моладзі і толькі 11% пенсіянераў, больш за 50% асобаў з вышэйшай адукацыяй і толькі 2—3% — з пачатковай. І справа не проста ў культурнай адсталасці ці прапагандзе — розныя сацыяльныя групы добра разумеюць, ці змогуць яны адаптавацца да «новага жыцця».







Такая карціна чаканняў павінная даць цалкам выразны ўрок палітыкам, што імкнуцца сабраць палітычны капітал на некалькіх прывабных лозунгах.

У заклiку «Беларусь у Еўропу» няма былой сэксапільнасці. Еўропа — гэта хутчэй ужо абрыдлы сужыцель, ад якога (як і ад Расіі) чакаюць не столькі жарсці, колькі практычных рэчаў. І таму, размаўляючы з электаратам пра Еўропу, вы не можаце не абыходзіць тэмаў, якія электарат ад ЕС адштурхоўваюць. У першую чаргу гэта пытанні сацыяльнай сферы, пенсійнай палітыкі, аховы здароўя, ЖКГ. Калі вы зможаце пераканаць выбаршчыкаў, што супрацоўніцтва з ЕС тут дапаможа — у вас ёсць шанец, калі не — вы па-ранейшаму будзеце здзіўляцца, чаму народ не вабіць цукерка ў сіняй абгортцы з бліскучымі зорачкамі.

# Адсалютавалі і забылі

Чаму ў святочны год няма грошай на дзіравы дах у кватэры ветэрана.

Сёлета парад у гонар Перамогі быў пампезны як ніколі. Асабліва ў сталіцы, дзе кіламетры галоўнага праспекта шчыльна завесілі каляровымі палотнішчамі, а савецкія гімнасцёркі з узнагародамі начапілі нават на манекенаў у цэнтральных крамах.

Сёлетні парад быў яшчэ і надзвычай марнатраўны. Як і летась, шматмільённымі (у даляравым эквіваленце) ахвярамі рэпетыцый вайсковай тэхнікі сталі сталічныя дарогі. А 9 мая неспрыяльнае надвор'е не спыніла арганізатараў святочнага салюта. Так і спапелі тысяча за тысячай бюджэтных даляраў, згасаючы ў цяжкіх шэрых хмарах.

А тым часам у Гродне на вуліцы Сацыялістычнай у кватэры Мікалая Цікунова ўжо сем гадоў цячэ дах. У кватэры зусёды сыра і холадна — летам 17 градусаў, зімой усяго 15. Банальная гісторыя, скажа нехта. Магчыма, але Мікалаю Мікалаевічу 84 гады. З вайны, на якую ён пайшоў у 17 год, вярнуўся інвалідам. Трое ягоных братоў не вярнуліся зусім.

Важкая прычына, каб мець шанаванне і спагаду на дзявятым дзясятку, падумаюць многія. Ды не, скажа закон РБ «Аб ветэранах», які не прадугледжвае бясплатнага рамонту за кошт сродкаў мясцовага бюджэту. Дый іх і няма, тых грошай, паціскаюць плячыма ў гродзенскай ЖКГ.

Сакрэт сёлетняй пампезнасці хутчэй не ў даце, хоць лічба «65» была зафіксаваная ці не ў кожным элеменце грандыёзнай мілітарысцкай пастаноўкі. Справа ў іншым — на носе выбары. А таму парад — толькі нагода, каб прадэманстраваць усім сваю моц і ўпэўненасць. Колькі б гэта ні каштавала.

У святочны 65-ы год Перамогі ні адна рука не ўзнялася перапісаць закон аб ветэранах, як не было гэта зроблена і да 60-годдзя. Ніхто не даўмеўся спыніць салют у дождж, каб ашчадзіць грошы (магчыма, і на некалькі дзіравых дахаў). Чаму? Бо сапраўдным героям, такім як Мікалай Цікуноў, у гэтай бессардэчнай гульні адводзіцца роля, не большая за ролю манекена з медалямі ў вітрыне ЦУМа.

Дзіравы дах 84-гадовага ветэрана нікога не хвалюе. Ну і праўда, каго турбуюць праблемы манекенаў?

**Сямён Печанко**

# У мінскіх казіно круцяцца грошы расіян, туркаў і армян

«Наша Ніва» прапануе своеасаблівае падарожжа па найбуйнейшых казіно Мінска.



БЕЛТА

### За суседнім аўтаматам з Пугачовай

Міжнародны холдынг Storm International — англійска-нідэрландская кампанія, але яе капітал адносяць да маскоўскіх алігархаў. Яна мае ў Мінску пакуль што ўсяго адно казіно, але якое! «Шангры-Ла» — найяскравейшы прыклад ідэі пераносу расійскага гульнявога бізнэсу ў Беларусь. Арганізаваныя авіятуры з Масквы, шыкоўныя ўмовы для гасцей — пяцізоркавы гатэль праз дарогу — ды абароненасць ад вачэй цікаўных беларусаў дазваляюць назваць «Шангры-Ла» самым прэстыжным казіно Беларусі. Ды яшчэ і самым дарагім. Мінімальны ўваходны абмен раней складаў $5000. Відаць, столькі багацеяў у краіне не назбіралася, бо два месяцы таму мінімальная цана гульні панізілася да $1000. Сярод заўсёднікаў казіно можна сустрэць зорак расійскай эстрады. Максім Галкін прыязджае як з выступленнямі, так і проста пагуляць. Двойчы за гульнявымі аўтаматамі бачылі і спявачку Алу Пугачову.

Дарэчы, трагічную гісторыю з самалётам, што разбіўся ў лесе пад Мінскам 26 кастрычніка 2009 года, таксама звязвалі з казіно. Па чутках, ахвяры авіякатастрофы ляцелі менавіта ў «Шангры-Ла». На месцы здарэння былі знойдзеныя целы пяці пасажыраў, сярод якіх быў Марат Рамашкін, генеральны дырэктар авіякампаніі «С-ЭЙР», якой належаў гэты самалёт.

Яшчэ адзін эксцэс здарыўся з будынкам казіно ў першыя дні працы. Анархісты закідалі яго піратэхнікай і факеламі, а на сцяне пакінулі надпіс: «Цябе ўжо прайгралі!»

### Піцерскі праект

Казіно «Вікторыя-Мінск» — таксама расійскае казіно. Вось толькі не маскоўскае, а піцерскае. Кіруе ім кампанія General Manager, якая, апроч Расіі, мае інтарэсы ў Латвіі і Харватыі.

За аўтаматамі «Шангры-Ла» двойчы бачылі Алу Пугачову.

Казіно працуе менш за год, і яго стварэнне таксама звязанае з забаронай на гульнявы бізнэс у Расіі. Каб адразу перахапіць ініцыятыву на мінскім рынку, расіяне прывезлі ў «Вікторыю» сваіх круп'е і іншы абслугоўваючы персанал. І сапраўды, пастаўленай мэты яны дасягнулі. «Вікторыя» лічыцца найбуйнейшым казіно Мінска, а прыезд казіно-турыстаў з Расіі пастаўлены на плынь. Інвестыцыі ў праект склалі $5 мільёнаў.

### Прывітанне з Бліжняга Усходу

Сусветную кампанію Princess International Group, якая валодае сеткай пяцізоркавых гатэляў і казіно па ўсім свеце, узначальвае турак Судзі Азкан. Ягоная жонка — беларуска, дзіва што дзелавыя інтарэсы прадстаўніка Турцыі прадстаўленыя менавіта ў нашай краіне. Гэта элітны гатэль Crowne Plaza і некалькі казіно Princess. Дарэчы, адно з іх уключыла ў свой забаўляльны комплекс вядомую яшчэ з савецкіх часоў рэстарацыю «Журавінка».

Інвестыцыі, укладзеныя ў казіно «Эмір», таксама маюць усходні каларыт. У ім прадстаўленыя арабскія інтарэсы.

### Нацыянальны прадукт

Казіно «Бадэн-Бадэн» — адна з нямногіх вялікіх забаўляльных устаноў з беларускім капіталам. Яно ўваходзіць у склад «Данькоў-клуба» і, адпаведна, належыць мінскаму бізнэсоўцу Юрыю Данькову. Амаль дзесяць гадоў таму той вылучаўся кандыдатам у прэзідэнты і нават прапаноўваў апазіцыйным кандыдатам вызначыць імя «адзінага» падчас гульні, маўляў, кандыдыт мусіць быць удачлівым. Данькоў палітычнай дзейнасцю займаецца толькі жартам, ён цвёрда трымаецца свайго забаўляльнага бізнэсу: рэстарана, начнога клуба і стрыптыз-шоу.

### Алімпійскія гульні па казіно

Эстонская кампанія Olympic Entertainment Group з'яўляецца найбуйнейшым аператарам казіно ў Балтыі. Апроч таго, кампанія працуе ў Польшчы, Славаччыне, Румыніі і Беларусі. Сусветны фінансавы крызіс адмоўна адбіўся на дзейнасці «Алімпіка». Калі ў 2008 годзе сумесны прыбытак кампаніі і філіяў складаў 143 мільёны еўра, то ў 2009 годзе на трацІну менш — 109 млн еўра.

Кампанія праславілася тым, што стала судзіцца з цэлай дзяржавай. 12 мільёнаў еўра — такі рахунак эстонцы выставілі Украіне. Менавіта такая сума інвестыцый была незваротна згублена пасля ўвядзення мараторыя на дзейнасць гульнявога бізнэсу ва Украіне.

У нашу краіну «Алімпік» прыйшоў у 2006 годзе. На сёння кампанія валодае пяццю кругласутачнымі заламі гульнявых аўтаматаў у Мінску: «Аляксандраў пасаж», «Нептун», «Эльдарада», «Спарта», «Троя». А вось сапраўднага казіно «Алімпік» у Беларусі дагэтуль не мае.

Аўстрыйскіх грошай у мінскіх казіно не заўважаецца.

Дырэктар беларускай філіі кампаніі Андрэй Прахарэнка расказвае, што, па яговых падліках, з пачатку дзейнасці «Алімпік казіно Бел» інвеставала ў эканоміку Беларусі каля $9 мільёнаў.

### Ад Югаславіі да Арменіі

Маскоўскія бізнэсоўцы, якія валодаюць сталічным казіно «Мілєніум», незадаволеныя, што ўстанова губляе свае пазіцыі. Канкурэнцыя з новымі гульцамі на рынку аказалася занадта складанай. За апошнія паўгода ў казіно ўжо тройчы змянілася кіраўніцтва.

Маскоўскім лічыцца і казіно «Калізей», а казіно «Роял» у гатэлі «Мінск» належыць пецярбургскім бізнэсоўцам.

Наконт таго, чые грошы круцяцца ў іншых казіно Мінска, сказаць складана. Кажуць, што «Глабал» прадстаўляюць армянскія бізнэсоўцы, а за «Зеўсам» стаяць прадпрымальнікі з тэрыторыі былой Югаславіі.

**Яўген Васількоў**

# Забаронены плод

Шмат якія дзяржавы вырашылі ліквідаваць гульнявы бізнэс на сваёй тэрыторыі. Сярод іх ёсць і краіны-суседкі Беларусі.

### Расія

Пачатак тысячагоддзя прынёс краіне сапраўдны гульнявы бум. У той час функцыянавала каля 2 тысяч казіно. Аднак у 2006-м былі прыняты спецыяльны закон, які рэгуляваў дзейнасць казіно. Усе ўстановы мусілі быць вынесеныя ў чатыры спецзоны: Калінінградская вобласць, Алтай, Прыморскі край і «Азоў-Сіці» на мяжы Растоўскай вобласці і Краснадарскага краю. З 1 ліпеня 2009 года закон цалкам уступіў у сілу. Аднак пакуль што легальна працуе толькі адно казіно — «Аракул» у зоне «Азоў-Сіці». Развіццё іншых зон затрымлівае недахоп інвестыцый. Астатнія казіно ці закрыліся, ці пераехалі ў іншыя краіны, ці пераназвалі свой бізнэс «латарэйным».

### Украіна

У маі 2009 года «аранжавая» прэм'ерка Юлія Цімашэнка ініцыявала (а дэпутаты Вярхоўнай Рады ўхвалілі) закон аб часовай забароне гульнявога бізнэсу ва ўсёй Украіне да з'яўлення пэўных тэрытарыяльных гульнявых зон. Прычынай паслужыў трагічны выпадак у Днепрапятроўску, дзе ў выніку выбуху ў зале гульнявых аўтаматаў «Метро-Джэк-Пот» загінулі дзевяць чалавек. Пазней высветлілася, што ў зале не выконваліся элементарныя правілы пажарнай бяспекі.

Тым не менш, мараторый не перашкодзіў пяцізоркаваму гатэлю «Прэм'ер-Палас» у цэнтры Кіева адкрыць новае казіно ў сакавіку 2010 года. Цяпер новы ўрад Украіны збіраецца часткова адмяніць забарону і развіваць гульнявы бізнэс у курортных раёнах, такіх як Крым і Карпаты.

### Польшча, Літва, Латвія

У краінах-суседках Беларусі, што належаць да Еўрасаюза, гульнявы бізнэс не забаронены. Так, існуюць некаторыя абмежаванні (напрыклад, у Польшчы не знойдзеш рэкламу казіно), але ў цэлым бізнэс развіваецца без радыкальнага ўмяшальніцтва з боку дзяржавы.

Частка краінаў рэгулюе гульнявы бізнэс, а ў некаторых (у тым ліку ў шэрагу мусульманскіх краінаў) ён цалкам забаронены. Вось некаторыя прыклады:

**Турцыя** — казіно забароненыя.

**Ізраіль** — казіно працуюць толькі на яхтах у Эйлацкім заліве.

**Казахстан** — казіно дазволеныя толькі ў двух гарадах, Капчагаі і Шчучынску.

**Венесуэла** — казіно забароненыя паўсюль, акрамя вострава Маргарыта.

**Арменія** — забарона ўступіць у сілу з 2013 года.

**ЗША** — кожны штат мае права сам вызначаць, як рэгулюецца гульнявы бізнэс. Пры гэтым толькі ў штаце Невада, там, дзе знаходзіцца знакаміты Лас-Вегас, казіно можна адчыняць у любым месцы. А вось у штатах Юта, Тэнэсі і на Гаваях казіно цалкам забароненыя.

**Яўген Васількоў**

# Улада згуляе ў казіно па сваіх правілах

Дзяржава будзе сачыць за тым, хто гуляе ў казіно, калі і колькі.

У параўнанні з суседнімі Украінай і Расіяй, у Беларусі для казіно і залаў гульнявых аўтаматаў — сапраўдная вольніца. Улады не хочуць пазбаўляць сябе ад нядрэнных падатковых уліванняў. Вось толькі на якіх умовах будзе развівацца рынак? Да прыняцця ў сакавіку 2010 года канцэпцыі развіцця гульнявога бізнэсу існавала некалькі варыянтаў вырашэння сітуацыі.

### Замест Лас-Вегаса пад Смалявічамі — «Вялікі брат»

Сярод адрынутых прапаноў развіцця галіны засталося будаўніцтва гульнявой зоны каля аэрапорта «Мінск-2». Па прыкладзе Расіі, на радасць насельніцтву Смалявічаў, разнастайныя казіно павінны былі сканцэнтравацца менавіта там, сярод пабудаваных рэстаранаў і начных клубаў. Аднак ідэю адкінулі: занадта дорага. Для стварэння такой гульнявой зоны патрэбна ўкласці больш за мільярд даляраў інвестыцый. Інвестараў на такую суму адшукаць складана.

Прапаноўваўся яшчэ адзін варыянт развіцця гульнявога бізнэсу ў Беларусі — яго цэнтралізацыя. Адкінуць слабых ігракоў на рынку, а моцных кантраляваць як мага больш уважліва.

Але ў выніку было вырашана зрабіць наадварот. Запрасіць усіх зацікаўленых інвестараў — і слабых, і моцных, і багатых, і бедных, — а пасля загнаць іх у такія рамкі, у якіх нескладана будзе наладзіць за імі абсалютны кантроль. І сапраўды — у Беларусі абвешчана пра планы стварыць цэнтралізаваную камп’ютарную касавую сістэму. Дзяржава будзе, нібы той «Вялікі брат», адсочваць, хто, у каго, як, дзе і калі выйграў пэўную суму.

Пытанні маральнасці гульнявога бізнэсу застаюцца на другім плане. Грошы не пахнуць — з такім лозунгам расчыніліся дзверы перад патэнцыйнымі інвестарамі, якія жадаюць адкрыць казіно ў Беларусі.

### Бонус бюджэту

Летась гульнявы бізнэс прынёс 11 мільёнаў еўра у мясцовыя бюджэты краіны. Па статыстыцы, у Беларусі дзейнічаюць больш за 40 казіно (траціна з іх у Мінску) і больш за 350 залаў гульнявых аўтаматаў. Асаблівасць беларускага падаткаабкладання ў тым, што падатковыя зборы з аўтаматаў бяруцца фіксаваныя, без уліку сумы выйгрышаў. У залежнасці да горада, у якім знаходзіцца ўстанова, з аднаго гульнявога стала ў казіно збіраецца 2500—4000 еўра падаткаў штомесяц, з аднаго аўтамата — 80—100 еўра.

Бізнэс звышпрыбытковы: інвестуеш адзін раз, а пасля грошы ліюцца ў кішэню ракой. Адзінае, што апошнім часам выдача новых ліцэнзій прыпыненая. Пакуль няма яснасці з новастворанымі правіламі гульні, новых інвестараў на рынак не пускаюць. Хто паспеў, той і з’еў.

### Цэнтралізаваны кантроль

Навіна апошніх дзён — афіцыйна абвешчана пра пачатак конкурсу на стварэнне «цэнтра кіравання» гульнявым бізнэсам. Адпаведную пастанову №668 прыняў Савет Міністраў 4 траўня 2010 года. Гэта мусіць быць камерцыйная арганізацыя, якая забяспечыць дзяржаўным органам кругласутачнае атрыманне поўнай інфармацыі аб абароце грашовых сродкаў у казіно. Цэнтр павінен працаваць як мінімум 10 гадоў. Мяркуючы па ўсім, гульню ў казіно улады пачынаюць па сваіх правілах.

**Яўген Васількоў**

# Школа спрытных рук

Школы круп’е пры розных казіно пастаянна праводзяць набор новых людзей.

Казіно — гэта не толькі забаўляльная ўстанова, у якой выйграюць альбо прайграюць мільёны, але яшчэ і працоўныя месцы для дзясяткаў людзей. Прафесія круп’е ўжо перастала ўспрымацца людзьмі як экзатычная. Імклівы рост колькасці казіно і залаў з гульнявымі аўтаматамі запатрабаваў новых і новых працаўнікоў. Некаторыя казіно, як, напрыклад, «Вікторыя», прывозілі ўслед за сабой расіян. Але гэта хутчэй выключэнне з правілаў. Школы круп’е пры розных казіно пастаянна праводзяць набор новых людзей.

Моладзь захапляецца магчымасцю працы без адукацыі і вопыту. Заробкі круп’е пачынаюцца ад $300 і, у залежнасці ад саліднасці ўстановы, дасягаюць $500—650. У дадатак можна разлічваць на шчодрыя чаявыя ад ігракоў. Той, хто выйграе некалькі дзясяткаў тысяч даляраў, наўрад ці пашкадуе пару сотняў, каб аддзячыць круп’е.

Жорсткія патрабаванні ад працадаўцаў для патэнцыйных круп’е — не быць студэнтам дзённага аддзялення, не прыцягвацца да крымінальнай ці адміністрацыйнай адказнасці, мець прывабны выгляд і быць схільным да навучання.

Чаму вучаць у школе? Правільна раздаваць карты, прадухіляць выпадкі махлярства. Давядзецца і ўзгадаць з часоў маленства табліцу множання, прычым не звычайную, да 10, а да 20. Гэтыя лічбы круп’е абавязаны імгненна пералічваць у галаве.

Навучальныя курсы працягваюцца ад аднаго да трох месяцаў. У некаторых школах слухачам нават выплачваюцца стыпендыі. Па расповедах былых круп’е, казіно з большым імпэтам бяруцца за навучанне новых супрацоўнікаў па карпаратыўных правілах, чым перавучваюць тых, хто працаваў у канкурэнта.

Асноўная праблема — непастаяннасць працы. Ні для каго не сакрэт, што круп’е часта ўступаюць у змову з ігракамі. Калі кіраўніцтва казіно заўважыла небяспечную тэндэнцыю — прыбытак катастрафічна зніжаецца, — стаць беспрацоўнымі могуць адразу некалькі круп’е, якія трапілі пад падазрэнне. Замест іх прыйдуць новыя, яшчэ «чыстыя» выпускнікі школ.

**ЯВ**

# Колькі іх, іграманаў?

Па інфармацыі дзяржаўнага рэабілітацыйнага цэнтра ў Мінску, з часу адкрыцця ўстановы ў 2007 годзе мэтанакіравана лячыліся ад гульнявой залежнасці каля дзесяці чалавек. Пасля лячэння яны перамаглі сваю хваробу.

Складанасць вядзення падлікаў у тым, што такія людзі звычайна маюць не адну форму залежнасці, а некалькі — яшчэ і ад наркотыкаў ці алкаголю.

Дактары адзначаюць, што праўдзівай афіцыйнай статыстыкі быць не можа, бо людзі часцяком лечацца ў асобных прыватных псіхатэрапеўтаў, каб не афішаваць сваёй хваробы.

**ЯВ**

# Разбор палётаў

Падчас парада 9 Мая была груба парушаная інструкцыя бяспекі, зацверджаная Мінабароны.

Пра небяспечны выпадак у небе над Мінскам «НН» пісала ў мінулым нумары. Дзяржаўныя СМІ прамаўчалі як вады ў рот набраўшы. Нагадаем: паводле відавочцаў, чацвёрка Су-24 у час парада 9 Мая, пры падлёце да праспекта Пераможцаў, рассыпалася. Адзін самалёт ледзь размінуўся з жылым домам. Адбывалася гэта акурат над натоўпам гледачоў.

Афіцыйны каментар Мінабароны на гэты конт, а фактычна — адмова ад тлумачэнняў, дзівіць. Бо ад гэтага ведамства чакаюць аналізу пазаштатнай сітуацыі ў небе над сталіцай.

Аналіз фота і відэа, зробленых у часе парада, указвае на парушэнне шэрагу палажэнняў «Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення дэманстрацыйных палётаў дзяржаўных паветраных суднаў», падпісанай у 2004 г. міністрам абароны Леанідам Мальцавым. Так, пункт 85 раздзела «Забеспячэнне бяспекі» кажа, што «палёт паветраных суднаў (ПС) над населенымі пунктамі павінен выконваца на вышыні, якая дазваляе ў выпадку нясправнасці ПС ажыццявіць пасадку, або пры неабходнасці катапультавацца (пакінуць ПС) за межамі населеных пунктаў, або на спецыяльна прадугледжаных для гэтых мэтаў пляцоўках». Пункт 86: «Манеўраванне (праходы) павінна выконвацца... без ухілу ў бок гледачоў бліжэй абмежавальнай лініі 200 м, а пры выкананні фігур на гледачоў — не бліжэй за 450 м па датычнай да фігуры». Мінімальная ж вышыня палёту павінна быць не меншай за 100 м, а пры выкананні фігур пілатажу — не меншай за 200 м.


ONLINER.BY

**«Гэта была суперaварыйная сітуацыя»**

Лётчык I класа палкоўнік вайсковай авіяцыі ў запасе Юрый Панамарэнка на просьбу «НН» прааналізаваў чатыры відэаролікі, зробленыя з розных пунктаў 9 мая ў Мінску.

«Я яшчэ ў жыцці за 25 каляндарных год лётнай практыкі такога страшнага выпадку не бачыў», — рэзюмаваў прагляд палкоўнік запасу.

Ён вызначыў некалькі ключавых момантаў на відэа: самалёты ляцелі занадта нізка, улічваючы, што іх маршрут пралягаў над жылым масівам і натоўпам гледачоў, гэта было празмерна рызыкоўна і неабгрунтавана. Небяспечным, на думку палкоўніка, было і тое, што курс чацвёркі Су-24 перасекся з курсам групы Л-39.

«Гэта была суперaварыйная сітуацыя. Маглі загінуць тысячы чалавек». Па назіраннях Юрыя Панамарэнкі, дзеянні пілота Су-24, які на відэа адкалоўся ад групы, выглядалі няўпэўненымі.

З відэаролікаў бачна, што пралёт адбываўся ў неспрыяльных метэаралагічных умовах (нізкая воблачнасць), на малой вышыні (меншай за 100 м), дзве групы самалётаў сышліся на перпендыкулярных курсах над галовамі тысяч гледачоў.

І гэта не першая такая сітуацыя. Летась вайсковы лётчык у адстаўцы Георгій Бухтарэвіч звярнуўся з лістом да кіраўніка краіны. У ім ён распавёў, што 9 мая 2005 г. над Мінскам у часе парада ледзь не сутыкнуліся звёны Су-25 і МіГ-29. Інцыдэнт тады быў амаль аналагічны.

Дэманстрацыя мускулаў можа давесці да вялікай бяды. Небяспечныя палёты над праспектам Пераможцаў сведчаць, што Бухтарэвіча не пачулі, дзе трэба.

**Сямён Печанко**

### З абмеркаванняў на byavia.net

* * *

«Загарэлася тэхніка на Бангалоры — ад Мінабароны каментароў не дачакаешся. Праляцелі самалёты дзіўнымі курсамі — зноў маўчанне. Выйдзіце і растлумачце, што да чаго. І ніякіх чутак, і ніякага страху. А нахабна хлусіць у эфіры на ўсю краіну, трымаць усіх за ідыётаў, калі ёсць сотня сведак і відэа ў інтэрнэце — гэта хамства па-за межамі прыстойнасці».

* * *

«Усе яны лётаюць над маім домам. Кожны год рэпетыцыі. І кожны раз баюся, што нешта пойдзе не так. Мне ўвогуле незразумела, які ідыёт дазваляе пры бачнасці 150 метраў парад авіяцыі над жылымі масівамі і натоўпамі людзей? А раптам адмова тэхнікі? А раптам прыступ сардэчны ў пілота? Што, будзе паўтарэнне Львова? Не хачу. Маю права».

**Авіяфорум «Крылы Беларусі»**
**byavia.net/forum**

### Чытачы з Ліды паведамілі нам

9 мая сваякоў тых лётчыкаў з Лідскай эскадрыллі «Белая Русь», якія бралі ўдзел у парадзе ў Мінску, тэрмінова сабралі і павезлі ў Мінск. Як ім сказалі, «каб зрабіць прыемнае мужам і бацькам». Родныя былі ўражаныя, што лётчыкі сустрэлі іх прыгнечаныя, стрэсаваныя.

# Аўто кандыдатаў

**На чым ездзяць людзі, што прэтэндуюць на найвышэйшую пасаду ў краіне, пра якія аўто мараць? На гэтыя ды іншыя пытанні «НН» адказваюць кандыдаты ў прэзідэнты.**

Быць прыкладам для большасці — адно з наканаванняў палітыкаў. І хоць даводзіцца чуць, што ў Беларусі палітыкі няма, людзі ўсё адно цікавяцца жыццём прэтэндэнтаў на ўладу. Узгадайма, які фурор выклікала публікацыя дэклараcый прыбыткаў кандыдатаў у мясцовыя саветы ў часе апошняй выбарчай кампаніі. Дзіўная рэч — многія чытачы незалежных сайтаў негатыўна выказваліся тады на адрас кандыдатаў ад апазіцыі, якія прадэманстравалі нізкія заробкі, а то і паведамілі пра сваё беспрацоўе. Маўляў, як такі чалавек будзе намі кіраваць, калі на сябе зарабіць не можа. Меркаванне спрэчнае, калі ўлічыць умовы, у якіх даводзіцца існаваць любому, хто наважваецца на публічнае апазіцыянаванне.

Палітыка — рэч дарагая. Удзел у выбарчых кампаніях патрабуе немалых сродкаў. Натуральна, што на старт кандыдаты выходзяць, маючы няроўныя ўмовы. Але ў нашым выпадку справядліва будзе казаць пра заведама штучна створаныя няроўныя ўмовы. Манапалізацыя дзяржаўных СМІ, падкантрольныя выбарчыя камісіі, адміністрацыйны рэсурс, выкарыстанне бюджэтных сродкаў дзеля грандыёзных папулісцкіх мерапрыемстваў (ваенізаваныя парады, дажынкі ды славянскія базары) — усё гэта, не сакрэт, каторую кампанію працуе на аднаго кандыдата.

З другога боку мы бачым дысідэнтаў, якія жывуць на сціплыя пенсіі, маладых лідэраў, што туляцца з сем’ямі ў аднапакаёўках і ездзяць на патрыманых аўто. Выбары прэзідэнта, акрамя ўсяго, добрая нагода, каб параўнаць побытавыя і этычныя стандарты, якімі кіруецца Лукашэнка і ягоныя апаненты.

«НН» пачынае цыкл артыкулаў пра беларускіх палітыкаў, якія заявілі пра ўдзел у чарговай прэзідэнцкай кампаніі, а таксама пра найбольш верагодных яе ўдзельнікаў, якія пакуль не абазначылі свае намеры. Чытачы даведаюцца, на чым ездзяць кандыдаты ў прэзідэнты, якой маёмасцю валодаюць, пра іх сямейнае становішча і захапленні. Пачнём з аўто.

## Ездзіць на «Шкодзе Феліцыя», марыць пра «Фольксваген Туарэг»

Першым пра ўдзел у кампаніі-2011 заявіў Алесь Міхалевіч. З яго і пачнём. Галоўным крытэрам для выбару аўто палітык лічыць надзейнасць, таму ён і набыў «Шкоду Феліцыя». Легкавік 2000 года выпуску аснашчаны рухавіком і падвескай ад «Фольксвагена», прабег — больш за 160 тысяч кіламетраў. Наогул, Міхалевічу падабаюцца нямецкія аўто. Высокі рост кандыдата дыктуе свае ўмовы, таму, калі б ягоныя мары прыйшлі да кампрамісу з магчымасцямі, ён набыў бы сабе «Фольксваген Туарэг». Ці іншы аналагічны пазадарожнік.

Аўто, на якім ездзіць прэзідэнт, павінна адпавядаць статусу пасажыра і гарантаваць ягоную бяспеку. «Гэта мусіць быць прадстаўнічы браняваны аўтамабіль, — мяркуе Алесь Міхалевіч. — У гэтым пытанні я не схільны вінаваціць Лукашэнку ў празмерным выдаткоўванні грошай».

## Чатыры гады на «Міцубісі»

Кандыдат у прэзідэнты ад БХД Віталь Рымашэўскі чатыры гады ездзіць на «Міцубісі Спэйс Вэган». Гэта першы ўласны легкавік палітыка, прабег яго сягае за 270 000 км. А дагэтуль Віталь набываў вопыт кіроўцы на службовых аўто.

Чаму «Міцубісі»? Палітык аддае перавагу практычным і функцыянальным аўтамабілям. «Каб і для працы зручная была, і для сям’і». У легкавіку Віталя можа змясціцца сем чалавек. Акрамя таго, Рымашэўскаму імпануюць суадносіны цаны і якасці аблюбаванага аўто.

Калі паўстане пытанне пра новае аўто, абіраць палітык будзе паміж еўрапейскімі і японскімі легкавікамі. І калі ўжо быць зусім дакладным, то паміж «Мерсэдэсам» і «Таётай». Аўто чыноўніка найвышэйшага рангу павінна быць прадстаўнічым, але аснашчэнне яго не павінна перавышаць разумныя межы бяспекі і зручнасці, мяркуе кандыдат ад БХД.

## Паміж «Вольва» і «Мерсэдэсам»

Лідэр Руху «За Свабоду» і кандыдат у прэзідэнты на выбарах 2006 года Аляксандр Мілінкевіч за стырном 47 гадоў. Апошнія гады ён ездзіць на «Вольва-S90», прабег — 280 000 км. У часе паездак па краіне гэтае аўто не раз аблівалі кіслатой, прабівалі колы. Аляксандр Уладзіміравіч кажа, што любіць таксама «Мерсэдэсы». Менавіта «Мерсэдэс» 1993 года выпуску ён дэкляраваў на мінулых выбарах. Увогуле, пры выбары аўтамабіля кандыдат у прэзідэнты кіруецца найперш зручнасцю, практычнасцю і дызайнам. Лідэр краіны, лічыць ён, павінен карыстацца прадстаўнічым аўто.

Мілінкевіч, хоць і любіць шведскія легкавікі, але пры гэтым мяркуе, што да ўзроўню скандынаўскіх краінаў, дзе палітыкаў найвышэйшага ўзроўню нярэдка можна ўбачыць у грамадскім транспарце, нам яшчэ далёка.

## «Мерсэдэс» і «Волга Сайбер»

Аляксандр Лукашэнка пакуль не сказаў цвёрдае «так» або «не» выбарчай кампаніі-2011, але мала хто сумняваецца, што яна пройдзе без яго. Перад пачаткам мінулай кампаніі Лукашэнка сярод іншай маёмасці задэкляраваў матацыкл Мінскага завода. Аднак ніхто не бачыў, каб кіраўнік дзяржавы дабіраўся ім на працу па праспекце Пераможцаў. Затое тысячы мінчукоў і жыхароў сталіцы ці ні штодня сутыкаюцца з заторамі, якія ўтвараюцца ў выніку праезду прэзідэнцкага аўто. Кіраўнік краіны ездзіць на браняваным «Mercedes-Benz-S600». Пра кошт канкрэтна гэтага аўто можна толькі здагадвацца, бо ў нас гэтая інфармацыя адносіцца да закрытай. Аднак, можна смела казаць пра лічбы ў сотні тысяч даляраў. Браняваны «Мерсэдэс» прэзідэнта Расіі, да прыкладу, каштуе каля 1,5 мільёна даляраў.

З інтэрв’ю расійскім журналістам двухгадовай даўніны вынікае, што гэта не адзіны легкавік у прэзідэнцкім аўтапарку. Лукашэнка прызнаўся тады, што Горкаўскі аўтазавод падарыў яму новую «Волгу Сайбер». «Нішто сабе так машына, нішто, — адрэкамендаваў ён тады навінку Горкаўскага аўтазавода. — Ну, канечне, гэта не «Мерсэдэс», але гэта ўжо і не «Волга»!»

## «Мне сніцца бацькава палутарка»

Паэт Уладзімір Някляеў, які ўзначаліў грамадзянскую кампанію «Гавары праўду», пра прэзідэнцкія амбіцыі пакуль не заяўляў. Аднак з’яўленне такой кампаніі незадоўга да выбараў прэзідэнта, ды яшчэ з такім харызматычным лідэрам, гаворыць само за сябе. Дый Уладзімір Пракопавіч не адмовіўся расказаць пра сябе. Аўто ён даўно не кіруе. Кажа, пасля аднаго здарэння, якое магло скончыцца вельмі трагічна, вырашыў за стырно больш не сядаць. «Я не кантралюю сябе за стырном — люблю хуткасць». Па справах паэт ездзіць на жончыным «Фіят Брава», на аўто сяброў і паплечнікаў, а то і на наймальным аўтамабілі. Аўтамабільная мара дзяцінства — грузавая палутарка, на якой бацька Уладзіміра Някляева правёз яго хлапчуком па ўсёй Смаргоншчыне. «Дагэтуль памятаю пах кабіны, нагрэтай на сонцы. Калі мне і сніцца аўта, дык бацькава палутарка».

Каардынатар «Хартыі-97» Андрэй Саннікаў адным з першых заявіў пра свае прэзідэнцкія амбіцыі. Але ад размовы з карэспандэнтам «НН» катэгарычна адмовіўся, назваўшы саму ідэю расказаць пра сябе патэнцыйным выбаршчыкам «кадэбісцкімі метадамі». «Мне хаваць няма чаго, у свой час я паведамлю ўсю неабходную інфармацыю. А вы працягвайце рабіць сваю брудную справу», — заявіў палітык.

**Сямён Печанко**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Мілінкевіч любіць «Вольва» і «Мерсэдэсы», але дазваляе сабе толькі не новыя машыны.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Рымашэўскі ездзіць на «Міцубісі» з прабегам 270 000.**



АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

**Міхалевіч на дэмакратычнай «Феліцыі».**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Лідэрам апазіцыі часта даводзіцца карыстацца «службовым» транспартам. На фота: 18 мая, супрацоўнікі міліцыі вывозяць актывістаў кампаніі «Гавары праўду» і маёмасць.**

# Вівальдзі і сэксуальнасць



Ванеса Мэй выступіць **20 чэрвеня ў мінскім Палацы спорту**. Квіткі ад 65 да 300 тыс.

**У Мінск прыедзе Ванеса Мэй — жывое ўвасабленне хаджэння класічнай музыкі «ў народ».**

Імідж — усё. Колісь прыхільнікі класічнай музыкі, адной з вяршыняў чалавечай культуры, аддавалі перавагу глыбіні над даходлівасцю. Цяпер пэўная частка «класічнага» істэблішменту шукае кампрамісы: ёй надакучылі паўпустыя залы. Класічная музыка хоча, каб яе пачулі масы. Дзеля гэтага выкарыстоўваюцца самыя сучасныя піяр-хады і іміджавыя гульні. Найперш вядзецца пра цяперашнюю моду падаваць класічную музыку ў спрошчаным, эстрадным варыянце. У спадзяванні, што гэта прывабіць у канцэртныя залы тысячы слухачоў «папсы».

Ванеса Мэй, брытанская скрыпачка кітайска-тайскага паходжання, — жывое ўвасабленне мары пра хаджэнне класічнай музыкі ў народ.

Пачынала Ванеса як тыповы музычны вундэркінд: у свае сем яна была наймаладзейшай вучаніцай у Каралеўскім музычным каледжы Лондана, а ў дванаццаць — запісала свой першы дыск.

Аднак у сярэдзіне 1990-х, хоць і не пакінуўшы скрыпкі, яна занялася поп-кар'ерай. Пік папулярнасці Ванесы прыпаў на пачатак 2000-х, калі яна, спалучаючы традыцыі і сучаснасць, накладала класічныя скрыпічныя партыі на тэхна-рытмы. Тады ж сфармаваўся яе імідж, які нагадваў хутчэй вобраз поп-спявачкі, чым класічнага музыкі: Ванеса здымае відэакліпы на свае кампазіцыі, агаляе цела, дэманструючы сваю экзатычную сэксуальнасць, актыўна бярэ ўдзел у свецкім жыцці поп-зорак, нават дэманструе на подыуме вопратку і ўпрыгожванні ад куцюр'е.

З іншага боку, Ванеса клапоціцца і пра іншы бок свайго іміджу: трэба ж давесці, што з чатырох гадоў у тваіх руках была зусім не тэнісная ракетка. Яе запрашаюць на BBC паразважаць пра жаночую эмансіпацыю, а як прапануюць супрацу з поп-спеваком Прынцам — дык толькі ў джазавым спецпраекце. Імідж вымагае.

Калі б Ванесы Мэй не было, яе б абавязкова прыдумалі. І першымі, пэўна, рэкламадаўцы. Яе музычныя здольнасці з аднаго боку і сэксапільнасць з экзатычнай азіяцкасцю з іншага, здаецца, дасканала прыстасаваныя для камерцыйных патрэбаў. Прыгадаем яе растыражаваны выступ ля лонданскага Таўэра, на капоце навюткага «Ровер-75» пад выблiскі фотакамераў.

Праціўнікі кажуць, што Мэй — эстрадная дзіва, якая проста першая выкарыстала скрыпку замест голасу. Што яе стыль — гэта ўсяго толькі нязграбнае накладанне штучных бубнаў на класічныя мелодыі. І што скрыпачоў такога ўзроўню — свет.

«Гэта выдатны ход менеджараў, гэта бок праца на стыку папсы і класікі. Нават у тым, што Мэй іграе творы даходлівых і простых для ўспрымання Чайкоўскага і Вівальдзі, стваральнікаў поп-музыкі свайго часу, — кажа музыказнаўца Ларыса Сімаковіч. — Аднак творчасць Ванесы Мэй мае хутчэй дачыненне да шоу, чым да сапраўднай музычнай творчасці».

**Лявон К**

# Украінцы і беларусы зноў абуліся ў лыжы

**Фестываль «Беларуская вясна ва Украіне» адкрыўся вясёлым флэш-мобам.**

У чацвёрты раз украінцы і беларусы абуліся ў лыжы і супольна пабеглі па Хрышчацціку. Так адкрыўся Фэст сучаснай беларускай культуры «Беларуская вясна», што пройдзе ва Украіне ад 10 да 22 мая.

У рамках «Беларускай вясны» ў Кіеве, Харкаве, Львове і Івана-Франкоўску адбудуцца выставы рэпартажнай фатаграфіі Belarus Press Photo-2010, відэапаказы, майстар-класы выцінанак, прэзентацыі «Белсата» ды яшчэ шмат чаго.

Наведнікі ўкраінскіх кнігарняў «Є» ва ўсёй Украіне змогуць набыць і выданні з серыі «Кнігарня «Наша Ніва».

На Украіну выправіліся Уладзімір Арлоў, Андрэй Хадановіч, Віталь Рыжкоў, Вольга Бабкова, Барыс Пятровіч, а Павел Касцюкевіч прэзентуе сваю кнігу седзячы ў Мінску праз інтэрнэт.

**Лявон К**



## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

### Аповесць пра мумітроляў перакладзеная на беларускую



**Янсан Тувэ. Маленькія тролі і вялікая паводка.** — Мінск: выдавец З.Колас, 2010

Мумітроль, Снусмумрык, Хатыфнаты... Беларуская перакладчыца першай аповесці пра мумітроляў «Маленькія тролі і вялікая паводка» Наста Лабада нагадвае, што ў сусветнай літаратуры няшмат пісьменнікаў, якія стварылі яскравы, але цалкам адасоблены свет з уласнымі законамі і насельнікамі. Тувэ Янсан — на пачэсным месцы. Аўтарка васьмі аповесцяў пра мумітроляў пісала творы і з іншымі героямі, але сапраўдную папулярнасць ёй прынеслі менавіта прыязныя, падобныя да маленькіх бегемоцікаў істоты.

Рукапіс «Маленькіх троляў і вялікай паводкі» (дата выхаду ў свет — 1945) быў выдадзены толькі пасля таго, як сябры параілі Тувэ зрабіць для аповесці ілюстрацыі, каб вобраз сям'і Мумітроляў атрымаў сваё завершанае ўвасабленне. У адрозненне ад «Каметы», напісанай падчас Другой сусветнай, «Паводка» не поўніцца змрочнымі вобразамі. І сканчаецца «Паводка», дзе Мумітроль і Мумімама шукаюць зніклага бацьку, шчасліва.

«Мы неяк так прывыклі, што ў казках станоўчыя героі адважна змагаюцца з адмоўнымі, — дадае Наста Лабада. — А Тувэ Янсан з першай кнігі пра мумітроляў кажа, што яе галоўныя героі — маленькія і слабыя. Аднак тая малеча здольная даць рады цяжкім абставінам жыцця, дзякуючы сваёй дабрыні».

### Вобраз шатана ў беларускай літаратуры раскрыты



**«Дзеяслоў» 2 (45) — 2010.** 334с., 1000 ас.

Новы нумар часопіса «Дзеяслоў» поўны літаратурных дзіўнотаў і чартаўні! Тут паэт Сяргей Прылуцкі з курортнай гісторыяй пра правінцыйную актору, што пасля забойства матроса ўцякае з псіхлякарні, каб сустрэцца са св. Антоніем. Іранічна-настальгічны палачанін Вінцэсь Мудроў каротка распавядзе пра джынсавы прывід, які ў 1970-я цягаў з полацкіх балконаў «Левайсы». Таксама ў нумары працяг эксперыментальнай вершаванай драмы Уладзіміра Някляева «Армагедон», дзе сярод дзейных асобаў Апендыцыт, Грыжа і Псіх. А пад заслону крытык Марына Весялуха раскрые вобраз шатана ў беларускай літаратуры XXI ст.

**ЛК**

### Палескі архіў выдалі вялікай кнігай



**В. Вярэніч. Палескі архіў: лінгвістычныя, этнаграфічныя і гістарычныя матэрыялы.** — Мінск: выдавец А. Вараксін, 2009.

Выйшаў «Палескі архіў. Лінгвістычныя, этнаграфічныя і гістарычныя матэрыялы» Вячаслава Вярэніча. Кніга стваралася 25 гадоў падчас экспедыцый, у якіх аўтар абследаваў каля 140 населеных пунктаў Беларусі (Піншчына, Мазыршчына, Нараўляншчына) і Украіны. Пераважная большасць матэрыялаў архіва — анамастыка. У даследаваных вёсках запісаны афіцыйныя прозвішчы, прозвішчы вясковыя, назвы палёў, сенажацяў, балот, рэк, геаграфічных аб'ектаў. Асобна падаецца лексіка жыхароў Лунінеччыны і Століншчыны. Друкуецца таксама невялікі «Палескі слоўнік», назвы хвароб на мясцовым дыялекце.

**Кастусь Матушыч**

## Сціcла

• **«Ляпіс Трубяцкой» будзе хэдлайнерам на «Басовішчы».** Выступ гурта запланаваны на завяршэнне другога дня «Басовішча». Каманда заедзе ў Гарадок у межах свайго еўрапейскага міні-тура. На «Басовішчы» сёлета ўпершыню за шмат гадоў не будзе N.R.M., «Крамы» ды «Нейра Дзюбеля». У праграме — «Тройца», «Гурзуф», «Адыс Абеба», Litvintroll.

• **Збор подпісаў за вуліцу Быкава.** Яго пачала 9 мая грамадзянская кампанія «Гавары праўду!». Прапануецца пераназваць вуліцу Ульянаўскую у Мінску і вуліцу Парыжскай Камуны ў Гродне, а таксама надаць імя пісьменніка адной з новых станцый метро. Таксама вядуцца перамовы, каб назваць у гонар пісьменніка адну з вуліц Хельсінкі, дзе Быкаў пражыў паўтара года.

• **Новая беларуская інтэрнэт-кнігарня.** Новы рэсурс — knihi.by — дазволіць хутка і проста набыць амаль любую кнігу на беларускай мове або пра Беларусь. А таксама і дыскі.

• **Выйшла кніга былой зняволенай савецкіх канцлагераў.** У кнізе «Мы марылі дома спаткацца» сабраны драматычны досвед адной з найстарэйшых удзельніц беларускага руху. Надзея Дземідовіч нарадзілася ў 1927 на Слонімшчыне. За ўдзел у Саюзе беларускай моладзі ў часе вайны яе адправілі на 25 гадоў у лагер. Удзельніца Кенгірскага паўстання вязняў, яна выйшла з ГУЛАГа ў 1956-м.

• **Алесь Разанаў атрымаў Doctor Honoris Causa.** Званне ганаровага доктара паэту надаў Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт «за выбітны ўнёсак у развіццё беларускай мовы і культуры і плённае спрыянне міжкультурнаму дыялогу». Званне ганаровага доктара ЕГУ маюць 13 асобаў, сярод якіх айцец Аляксандр Надсан, Кшыштаф Занусі і Альгірдас Бразаўскас.

• **Памёр Анатоль Шагаў.** 13 мая не стала заслужанага дзеяча мастацтваў, музыкі, хормайстра, дырыжора. Ён быў галоўным хормайстрам Акадэмічнага хору імя Цітовіча, пасля жыў у Вілейцы, дзе ўзначальваў школу мастацтваў. Праз Шагава прайшла вялікая колькасць харавых калектываў.

• **Новыя забавы на «Be2gether».** На музычным фестывалі, што пройдзе 25—27 чэрвеня ў Нарвілішках ля беларускай мяжы, гледачы змогуць ажаніцца, паўдзельнічаць у стварэнні глінянага горада на плошчы ў 50 кв. м і нават пагуляць у спартовы хіт сезона — басабол. Гэта накшталт валейбола, толькі на надзіманай пляцоўцы з паветранымі трамплінамі абапал. На фэсце выступяць Empire Of The Sun, Skunk Anansie, Silence Family. Беларускім хэдлайнерам будзе Лявон Вольскі з «Белай яблыняй грому».

**АП, ЛК, КМ, «Салідарнасць», «Рэгіянальная газета»**

# Брат, або Герой ненапісанай аповесці Быкава



Хведар Галавач у часы беларусізацыі. Бабруйск, 1920-я.

Саветы яго не дабілі, забілі свае. Піша **Андрэй Вашкевіч**.

Я даведаўся пра гэтага чалавека гадоў пяць таму, калі пабачыў у адной з залаў гродзенскага музея сталых людзей з кветкамі. Тое было незвычайна: прымянне школьнікаў у піянеры з прамовамі ветэранаў і кветкамі сярод музейных экспанатаў адышло ў мінулае. Падышоў да іх, загаварыў. Аказалася, што вось ужо больш за дваццаць гадоў Леанід Галавач з сястрой і дзецьмі прыходзіць у музей у дзень смерці свайго бацькі Хведара Рамановіча, брата расстралянага ў 1930-я пісьменніка Платона Галавача. Прыходзіць да фотаздымка ў музеі, бо не мае іншага месца ўшанаваць памяць пра бацьку.

Жыццё Хведара Галавача вартае літаратурнага твора. Вартае найперш сваёй трагічнай звычайнасцю, бо такіх лёсаў было вельмі шмат, і менавіта праз іх адлюстроўваецца дарога ўсёй нацыі.

Пра яго лёс хацеў напісаць аповесць Васіль Быкаў, яшчэ калі жыў у Гродне. Нават, казаў спадар Леанід, пачаў быў рабіць накіды.

Хведар быў на два гады старэйшы за Платона. Братам прыйшлося нясоладка ў дзяцінстве, калі памерла іх маці. Хлопчыкі, пакуль былі малыя, падаліся ў вясковыя пастушкі. А як падраслі, абодва рушылі ў горад. Платон зрабіўся пісьменнікам, Хведар жа працаваў дарожным майстрам спачатку ў Бабруйскай акрузе, а пасля на Палессі. З братам ён падтрымліваў адносіны аж да ягонага арышту.



Хведар Галавач у 1941 г.

Расстрэл Платона Галавача дзіўным чынам не зачапіў Хведара. Аднак у параўнанні з тым, што давялося яму перажыць пасля, гэта наўрад ці можна назваць удачай. У 1939 годзе ён быў мабілізаваны на Фінскі фронт і пасля восем гадоў не здымаў вайсковай формы. У красавіку 1942 года з дзясяткамі тысяч салдатаў разгромленага немцамі Крымскага фронту ён трапіў у палон. Далей былі дзесяць месяцаў за калючым дротам, уцёкі з чарговага лагера ва Уладзіміры-Валынскім у лютым 1943-га. Ужо ў сакавіку Хведар Галавач далучыўся да партызанаў. Заканчэнне вайны не прынесла палёгкі. Да брата рэпрэсаванага пісьменніка, які да таго паспеў трапіць у нямецкі палон, улада ставілася насцярожана. Урэшце, у 1946-м Хведара накіравалі кіраўніком дарожнага аддзела ў Гродзенскі раён.

На Гродзеншчыне ў гэты час ішла сапраўдная грамадзянская вайна. Не верыцца, калі апошнія сведкі тых падзеяў расказваюць, як на вуліцах амаль вымерлых цяпер вёсак грукаталі стрэлы. Ахвярамі гэтай неаб'яўленай вайны радзей станавіліся непасрэдныя ўдзельнікі – «бандыты» ці савецкія сілавікі. Найчасцей гінулі старшыні сельсаветаў, настаўнікі, службоўцы з ліку такіх самых беларусаў, толькі з Усходу.

Бралі на прыцэл «лясныя браты» і Хведара. Але Галавачу шанцавала. Некалькі разоў яго перахоўвалі сяляне. Зразумела, не праз нейкую прыхільнасць да савецкай улады, проста, як заведзена ў рэлігійных людзей, заступаліся за таго, каму пагражае небяспека. Дый большасць паважала маўклівага начальніка дарожнага аддзела, бо справай таго было не агітаваць за калгасы, а будаваць дарогі і масты.

Але здарылася тое, што было наканавана. Хведар Галавач знік ля лясной вёсачкі Рыбніца восенню 1950 года. Цела яго так і не адшукалі, а спадар Леанід успамінае, як яго, адзінаццацігадовага хлапчука, некалькі разоў вазілі на апазнанне напалову раскладзеных чалавечых парэштак...

Чаму варта ўспомніць Хведара Галавача? Толькі таму, што ён быў братам знакамітага пісьменніка ці таму, што мог стаць героем аповесці класіка нацыянальнай літаратуры? Канечне ж, не. Проста вельмі хочацца яшчэ раз успомніць аб пакаленні, якое расло дзеля таго, каб будаваць «шыпшыну-Беларусь», але загінула ў полымі сталінскіх чыстак, сусветнай вайны і неаб'яўленай вайны грамадзянскай.

Сёння Леанід Галавач дамагаецца ад гарадскіх і раённых уладаў дазволу за ўласныя грошы ўсталяваць у Рыбніцы, дзе загінуў яго бацька, памятную шыльду або знак. Чыноўнікі складаюць адпіскі, справы да даўняй і звычайнай у тыя часы трагедыі ім няма. Такая шыльда на маленькай лясной чыгуначнай станцыі была б напамінам пра трагедыю ўсіх беларусаў, якіх цягам усяго XX стагоддзя прымушалі знішчаць адно аднаго.

**Платон Галавач**

вырасшы сіратою, пастушком, стаў адным з найцікавейшых пісьменнікаў. Аўтар прыгожай аповесці «Спалох на загонах». Як і большасць прадстаўнікоў «расстралянага адраджэння», замардаваны саветамі.

# Сям'я Вянгеравых

Яшчэ адны славутыя суайчыннікі. Піша **Юлія Андрэева**.

Зямля беларуская настолькі шчодрая на таленты, што часам мы забываем выдатных людзей краіны, якіх з удзячнасцю помніць свет. Яскравы прыклад — сям'я Вянгеравых, што жыла ў другой палове XIX стагоддзя ў Мінску. Народжаныя ў імперыі, гэтыя высокаадукаваныя людзі служылі расійскай культуры, якая дамінавала. Можна толькі ўявіць, якую неацэнную карысць прынеслі б культуры нацыянальнай. Калі б іншы час.

Бацька, Апанас Вянгераў, быў бізнесоўцам і грамадскім дзеячам, дырэктарам Мінскага камерцыйнага банка. Яго жонка Паўліна Вянгерава, дачка габрэйскага філосафа Ягуды Эпштэйна, — пісьменніца, аўтар кнігі «Успаміны бабулі», якая і сёння з'яўляецца настольнай для тых, хто вывучае культуру беларускага мястэчка.

Іх старэйшы сын Сямён Вянгераў (1855, Мінск — 1920, Петраград) — літаратуразнаўца і энцыклапедыст, прафесар Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта. Ён быў рэдактарам літаратурнага аддзела слоўніка Бракгаўза і Эфрона, выдаўцом першай у Расіі «Бібліятэкі вялікіх пісьменнікаў» і заснавальнікам Пушкінскага семінарыя, у якім выгадаваліся Ганна Ахматава, Мікалай Гумілёў і Восіп Мандэльштам.

Яго сястра Зінаіда Вянгерава (1867, Мінск — 1941, Нью-Ёрк) падчас жыцця ў Санкт-Пецярбургу праводзіла літаратурны салон, дзе збіраліся інтэлектуалы з ко-ла гэтак званых богашукальнікаў. Таленавітая перакладчыца, яна пазнаёміла расійскамоўных чытачоў з творамі Гамсуна, Метэрлінка, Шоу, а англамоўных чытачоў — з раманамі Талстога.



Адзін з рэдкіх здымкаў, на якім ёсць славутая піяністка. Сняданак у А. Чумінай у гонар Маскоўскага Мастацкага тэатра. Ізабэла Вянгерава — крайняя справа, сядзіць за сталом.

Але найбольш праславілася малодшая з гэтай сям'і — піяністка і педагог Ізабэла Вянгерава (1877, Мінск — 1956, Нью-Ёрк). Перад тым як распачаць бліскучую сусветную кар'еру, яна вучылася ў Мінску, а потым ў Вене ў славутага фартэпіяннага педагога Тэадора Лешатыцкага. Каб трапіць у яго клас, трэба быў не толькі талент, але і моцны прафесійны фундамент, закладзены ў раннім дзяцінстве. А значыцца, сцверджанні пра тое, што ў дарэвалюцыйнай Беларусі не было музычнай адукацыі, — міф, створаны каланізатарамі.

> Яе славуты вучань Леанард Бернстайн называў яе «The Beloved Tyranna» — улюбёная тыранка.

Апрача канцэртнай дзейнасці, Ізабэла Вянгерава з 1907 года выкладала у Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі і хутка набыла надзвычайны педагагічны аўтарытэт. У 1920 годзе яна эміґравала ў ЗША, а ў 1924 годзе заняла пасаду прафесара ў новаствораным Інстытуце Кёртыса. Дзякуючы аўтарытэту мадам Вянгеравай або проста Мадам, як называлі яе ў ЗША, гэтая ўстанова неўзабаве стала адной з найбольш славутых кансерваторый у свеце.

Педагагічная сістэма Вянгеравай знайшла адлюстраванне ў мностве кніг. З вучнямі Мадам была строгая да жорсткасці. Нават сталыя музыканты, трапіўшы ў яе клас, мусілі спачатку рабіць цяжкія і балючыя практыкаванні для рук і толькі потым пераходзілі да сапраўдных артыстычных задач. Яе славуты вучань Леанард Бернстайн называў яе «The Beloved Tyranna» — улюбёная тыранка. Не звыклыя да такога абыходжання амерыканцы не вытрымлівалі яе вечнай лаянкі і кідання крэсламі. Напрыклад, Ван Клайберн ад яе хутка ўцёк.

Затое таленавітыя юнакі з эміґранцкіх сем'яў пачуваліся ў яе класе як рыба ў вадзе. Многія з іх — Бернстайн, Барбер, Фос, Графман — сталі выдатнымі музыкантамі. Яны ведалі, што за перфекцыянізмам і нецярпімасцю Вянгеравай хавалася высакародная натура. Падчас Вялікай дэпрэсіі яна на цэлы год адмовілася ад педагагічных заробкаў. Ад канцэртнай дзейнасці яна адышла яшчэ пры канцы 1920-х.

На жаль, мастацтва Вянгеравай як піяністкі не захавалася нават у грамзапісе. Яна не дазваляла сябе фатаграфаваць, не давала інтэрв'ю. Яе фота настолькі дорага каштуюць, што ў інтэрнэт-крамах не публікуюць вокладкі кніг з яе выявай. Адзіны родны для яе чалавек — музыказнаўца і дырыжор Нікалас Сланімскі — памёр у 1995 годзе. Астатняй надзеяй здабыць звесткі пра Вянгераву застаюцца мінскія архівы. Калі, нарэшце, нехта туды дабярэцца.

# Найлепшыя беларускія фота апошніх гадоў

12 мая ў межах мінскага фотасалона на Фотафоруме-2010 узнагародзілі лаўрэатаў першага беларускага конкурсу прэс-фатаграфіі. На конкурс было даслана больш за 1200 прац. У журы ўвайшлі аўтарытэтныя фатографы і фотарэдактары з розных краін, у тым ліку штатныя супрацоўнікі вядучых сусветных агенцтваў — Associated Press, Agence France-Presse.

Сярод пераможцаў чатыры прадстаўнікі рэгіёнаў: Васіль Зянько са Стоўбцаў, Аляксандр Саенка з Гродна, Мікалай Цітоў з Магілёва, Алег Рубчэня са Слуцка. Большасць лаўрэатаў конкурсу працуе ў Мінску. У спісе лаўрэатаў дзве дзяўчыны. У тым ліку два прызавыя месцы на конкурсе ўзяла фотакарэспандэнтка «НН» Юлія Дарашкевіч.

Гран-пры конкурсу атрымаў Віктар Драчоў, які здымае для агенцтва Франс-Прэс (Agence France-Presse).

Пабачыць выставу з працамі пераможцаў можна на Фотафоруме-2010 (Я.Купалы, 27).

**АП**


**Васіль Зянько. Ранішняя ідылія. Дзік — сябар сям'і. Стоўбцы, 2005.**


**Юлія Дарашкевіч. Спецназаўцы адбіраюць бел-чырвона-белы сцяг. Мінск, верасень 2005.**



**Васіль Фядосенка. Сваякі сабраліся вакол будынка, дзе трымаюць арыштаваных удзельнікаў Плошчы. Мінск, 25.03.2006.**


**Віктар Драчоў. Радыяцыйны інстытут медыцыны. Уладзіслаў Пятроў (3,5 года) з Чачэрска атрымаў магчымасць лекавацца тут. Гомель, 02.09.2005.**


**Юлія Дарашкевіч. Мінск. Спаборніцтвы па спартыўных танцах сярод інвалідаў-вазочнікаў. Мінск, кастрычнік 2008.**


**Віктар Драчоў. Дазіметрычны кантроль у вёсцы Губарэвічы Хойніцкага раёна. Вёска размешчаная за 3 км ад зоны адчужэння вакол Чарнобыльскай АЭС. 20.04.2006.**


**Наталля Аблажэй. Салдат нясе карціну каля Мастацкага музея. Мінск, 11.02.2008.**




## КАНЦЭРТЫ



### Віталь Стахіевіч

Піяніст Віталь Стахіевіч, лаўрэат міжнародных конкурсаў, магістр Амстэрдамскай касерваторыі дае тры канцэрты ў Беларусі. **20 мая — Полацк, Сафія, 18.00. 21 мая — Гродна, Новы Замак, 19.00. 27 мая — Мінск, Белдзяржфілармонія, Вялікая зала, 19.00.** Праграма: Моцарт. Саната ля мінор. Бах–Бузоні. Чакона. Шапэн. Тры Накцюрны. Саната №2.

### Вайцюшкевіч у Мінску

**20 мая ў Палацы культуры ветэранаў (вул. Купалы, 21)** — канцэрт Зміtра Вайцюшкевіча. Спявак выступіць з праграмай на вершы Уладзіміра Караткевіча. **Пачатак а 19-й.**

### «Тройца» ў КЗ «Мінск»

**30 мая а 19-й ў Малой зале КЗ «Мінск»** — канцэрт этна-трыа «Тройца» «Траецкая сустрэча». Гурт Івана Кірчука зноў гатовы акунуць кожнага, хто жадае, у глыбіні народнай свядомасці. У дзень светлы, адмысловы, напоўнены радасцю высокага свята. Этна-трыа «Тройца» запрашае ўсіх на музычную сустрэчу, амаль хатнюю, дзе ўсім будзе камфортна…

### Беланогая і Шалкевіч у Мінску

**20 мая ў Тэатры беларускай драматургіі** адбудзецца вечар сучаснай беларускай песні і паэзіі «Рытмы і рыфмы» з удзелам Таццяны Беланогай, Юрыя Несцярэнкі і Віктара Шалкевіча. Вядучы мерапрыемства — Мюр Фарыдовіч. Спецыяльны госць — пісьменніца Людміла Рублеўская. **Пачатак а 19-й.**

### Русальны канцэрт

**27 мая ў Малой зале КЗ «Мінск»** пройдзе «Русальны канцэрт» вакальнага гурта **«Гуда»**, які спявае старадаўнія народныя песні. Удзел бярэ этнічна-перкусійны праект **Drummaterria**. **Пачатак а 19-й.**

### Дударскі фэст

**19 мая на танцавальнай пляцоўцы парка Чалюскінцаў** пройдзе Дударскі фэст. Бяруць удзел гурты **«Стары Ольса»**, **«Зніч»**, **Litvintroll**, **Testamentum terrae**, **«Кейлі Кёл»**, **«Расалія»**, **Unia**. **Пачатак у 18.00.** Цана білетаў 20—25 тысяч рублёў. Даведкі і замова квіткоў: (029) 649-08-88.

### «Ляпіс Трубяцкой» і «Рубль» у Сілічах

**29 мая ў Сілічах** пройдзе рок-фестываль «Паляна», хэдлайнерамі якога будуць гурты **«Ляпіс Трубяцкой»** (Беларусь) і **«Рубль»** (Расія). «Рубль» — гэта гурт музыкі Сяргея Шнурава. Так што дзяцей лепей на канцэрт не браць — са сцэны могуць гучаць маты.

## ФУТБОЛ

### Кубак Беларусі

**23 мая на мінскім стадыёне «Дынама»** пройдзе фінальны паядынак на Кубак Беларусі. За трафей пазмагаюцца геаграфічныя суседзі **БАТЭ (Барысаў) — «Тарпеда» (Жодзіна)**. БАТЭ аднойчы (2006) валодаў Кубкам, яшчэ чатыры разы трапляў у фінал. А вось жодзінцы ўзняліся на такія вышыні ўпершыню. **Пачатак у 18.00.** Уваход вольны.

## ІМПРЭЗЫ

### Вір

**28 мая а 19-й у Музеі імя Янкі Купалы ў Мінску** адбудзецца музычна-паэтычная вечарына «Вір» з удзелам праекта **«Dzivasil»**. Вас чакае знаёмства з беларускімі этнічнымі інструментамі і старадаўнімі песнямі.

### Гістарычная ўрбаністыка

**19 мая ў 18.30 у Гістарычнай майстроўні (вул.Сухая, 25) і 20 мая у 18.30 у кнігарні галерэі «Ў» (пр. Незалежнасці, 37а)** пройдуць сустрэчы з аўтарамі і рэдактарамі даследаванняў па гістарычнай урбаністыцы і антрапалагічнай гісторыі Беларусі. Удзел бяруць гісторыкі Захар Шыбека і Алесь Смалянчук. Таксама пройдзе віртуальная экскурсія па даўніх мястэчках Беларусі. Уваход вольны.




### Кола Міколаў

**21 мая паэтычны тэатр «Арт.С»** прадстаўляе вечарыну «Кола Міколаў». Вас чакаюць сустрэчы з Міколамі (Аўрамчык, Адам, Віч, Гіль, Касцюкевіч, Малахоўскі, Пруднікаў, Чарняўскі, Шабовіч) і сынам Міколы (Зэкаў). **Пачатак а 18-й у бібліятэцы Цёткі (вул. Талбухіна, 12а).** Уваход па коле.

## ВЫСТАВЫ

### Грунвальд на палотнах

**У Гістарычным музеі (вул. Маркса, 12)** працуе мастацкая выстава «Вобразы мінуўшчыны», прысвечаная 600-годдзю Грунвальдскай бітвы. У экспазіцыі шырока прадстаўленыя амаль усе мастацкія жанры: партрэт, краявід, батальны жанр. Пачэснае месца займае тут гістарычны партрэт. Гэта выявы князёў Альгерда, Кейстута, Вітаўта…

### Шагал, Маціс, Пікаса

**У Мастацкім музеі** працуе выстава «Шагал і мастакі еўрапейскага авангарда», на якой экспануюцца творы Анры Маціса, Хуана Міро, Жоржа Брака, Пабла Пікаса, Фернана Лежэ, Марка Шагала… Выстава працуе **да 23 мая**.

### Ажаніцца — не журыцца

**У Музеі Максіма Багдановіча (вул.Багдановіча, 7а) да 30 чэрвеня** працуе мастацка-дакументальная выстаўка «Ажаніцца — не журыцца», прымеркаваная да 95-годдзя першай публікацыі вершаванай казкі Максіма Багдановіча «Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык». Выстаўка прысвечана святу вяселля.

### Жывапіс у Нармандыі

**Апошні тыдзень (да 25 мая) працуе ў Мастацкім музеі (вул. Леніна, 20)** выстава «Жывапіс у Нармандыі». Гэты ўнікальны збор твораў мастацтва вандруе па свеце як калекцыя, якая паказвае зараджэнне імпрэсіянізму ў Францыі.

### Святло стагоддзяў

**У Музеі гісторыі беларускай літаратуры (вул.Багдановіча, 13)** экспануецца літаратурна-мастацкая выстава «Святло стагоддзяў», прымеркаваная да юбілейных дат асветнікаў зямлі беларускай — Кірылы Тураўскага, Міколы Гусоўскага, Францішка Скарыны, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага.

## ТЭАТРЫ

### Тэатральны феерверк у Мінску

**Ад 24 да 30 мая у Мінску** пройдзе Беларускі міжнародны фестываль тэатраў лялек. Свае самыя яркія пастаноўкі прывязуць тэатральныя калектывы з Бельгіі, Латвіі, Польшчы, Расіі, Славеніі, Украіны, Эстоніі і, канечне ж, Беларусі. Фестываль разгорнецца на чатырох пляцоўках Мінска: Тэатра лялек, Купалаўскага тэатра, тэатра імя Горкага і «Новага тэатра». У рамках імпрэзы можна будзе пабачыць, напрыклад, спектаклі **«Папялушка. Урыўкі з яе дзённіка»** славенскага «Міні-Тэатра» **(Малая сцэна Купалаўскага, 25, 27 мая, 16.00)**, **«Магічнае люстра пана Твардоўскага»** Гродзенскага тэатра лялек **(Купалаўскі тэатр, 25 мая, 20.00)**, **«Яўгеній Анегін»** тэатра з расійскага Кемерава **(«Новы тэатр», 26, 27 мая, 20.00)**, **«Poison»** Магілёўскага тэатра лялек **(Купалаўскі тэатр, 28 мая, 11.00 і 14.00)**, **«Антыгона»** Палтаўскага тэатра лялек **(Малая сцэна Купалаўскага, 29 мая, 18.00)**, **«Жанчына-Крумкач»** тэатра «Агара» з Бельгіі **(Малая зала Палаца Рэспублікі, 29 мая, 19.00)**




**20 мая**

**Тэатр імя Горкага** — «Бег»
**Купалаўскі тэатр** — «Хам»

**21 мая**

**Тэатр лялек** — «Гісторыя аднаго горада»
**Тэатр юнага гледача** — «Тарас на Парнасе»
**Тэатр імя Горкага** — «Уяўны хворы»
**Купалаўскі тэатр** — «Не мой»
**Тэатр оперы і балета** — «Шапеніяна», «Пахіта», «Балеро»

**22 мая**

**Тэатр лялек** — «Прыгоды Пін-Піна»
**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Квакі і квокі»
**Тэатр імя Горкага** — «Зоркі сёмага неба»
**Купалаўскі тэатр** — «Не мой»
**Тэатр імя Горкага** — «Васа»

**23 мая**

**Тэатр юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Тэатр лялек** — «Піпі-Доўгаяпанчоха»
**Купалаўскі тэатр** — «Афрыка»
**Тэатр оперы і балета** — «Стварэнне свету»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Зіма»
**Купалаўскі тэатр** — «С.В.»
**Тэатр імя Горкага** — «Пакінутая жанчына»

**24 мая**

**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Вячэра з прыдуркам»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**Купалаўскі тэатр** — «Я не пакіну цябе»

**25 мая**

**Тэатр оперы і балета** — «Набука»
**Тэатр імя Горкага** — «Легенда пра беднага д’ябла»

**26 мая**

**Тэатр імя Горкага** — «Пане Каханку»
**Купалаўскі тэатр** — «Сымон-музыка»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Усё будзе класна! 65 кг Гарохаў»

## КІНО

# Прыгажунчык-2

**Zweiohrküken**
Нямеччына, 2009, каляровы, 124 хв.
**Рэжысёр:** Ціль Швайгер
**Ролі выконваюць:** Ціль Швайгер, Эдыта Малоўчыч, Эма Швайгер, Уладзімір Клічко
**Жанр:** Камедыйная меладрама
**Адзнака:** 4 (з 10)




Луда (Прыгажун) і Ганна ўжо два гады, як жывуць разам. Жарсці сцішыліся, побыт заядае, а тут яшчэ Луда сустракае сваю былую пасію. Ганна вырашае адпомсціць і запрашае ў госці старога сябра. Каханне герояў пад пагрозаю.

Фільм — набор скетчаў на сямейную тэму. Брудная бялізна на падлозе, нявыкінутыя бутэлькі, балбатлівыя натацыі — і мужчынскае старэнне пад наглядам пільнае жонкі. Хатнія сцэнкі ўскладняюцца рэдкімі прыгодамі ў начных клубах і нясціплажартоўнымі кадрамі, што вартасці фільму не дадаюць.

Нягледзячы на гэта, карціна застаецца спраўным практыкаваннем на тэму «жанчына і мужчына», што выклікае прыязнасць дзявочай аўдыторыі. Але «Прыгажунчык-2» — ужо другой свежасці.

**Андрэй Расінскі**

# Калі машына пахне блінамі



### Ці шкодзіць рухавіку біядызельнае паліва?

2010 год — апошні для выканання Дзяржаўнай праграмы па забеспячэнні вытворчасці дызельнага біяпаліва ў Беларусі на 2007—2010 гады. Згодна з праектам, увесь аб'ём дызпаліва ў краіне мусіць прадавацца з 5-працэнтавым дадаткам рапсу. Эфект — ашчаджэнне 300 тысяч тон нафты штогод.

На цяпер у Мінску ўсяго 10 з 79 заправак маюць асобную калонку з біядызельным палівам. Адкрываць новыя пакуль не дазваляе попыт: уладальнікі новых дарагіх іншамарак не рызыкуюць заліваць падазронае «БП» у свае бакі.

Беларускае біяпаліва — гэта 95% традыцыйнай салярκі і 5% метылавых эфіраў тлушчавых кіслот рапсавага алею. Такая сумесь цалкам адпавядае нарматыўным патрабаванням да паліва, якія выстаўляюцца ў краінах ЕС. Сярод плюсаў такога алейнага дадатку называюць змяншэнне колькасці шкодных выкідаў у атмасферу, лепшую шмаравальную здольнасць рапсавага паліва.

У ЕС наогул няма чыстай салярκі, там усё дызельнае паліва ідзе з такім 5-працэнтавым дадаткам. А вось біяпалівам на Захадзе называюць 100-працэнтавы заменнік — вельмі добра ачышчаны рапсавы алей халоднага выціску. Таму, набываючы дызельнае аўто, не варта баяцца маркіроўкі «не эксплуатаваць на біядызелі» (no biodiesel) — гаворка ідзе менавіта пра 100-працэнтнае біяпаліва.

Прадстаўнікі афіцыйных імпарцёраў заходніх аўто кажуць, што на паперы ўсё сыходзіцца, і беларускае паліва заліваць у машыны можна. Такога меркавання прытрымліваюцца прадстаўнікі «Сітраена», «Рэно», «Пежо», «Фольксвагена», «Мазды»... Але ў прыватных размовах яны кажуць, што свае аўто біяпалівам не запраўлялі б. Маўляў, цяжка адсачыць, ці дакладна вытрымліваецца тэхналагічны працэс яго вырабу і захоўвання. Напрыклад, захоўваць біядызель можна не болей за тры месяцы — пасля арганічныя рэчывы, якія ў ім утрымліваюцца, пачынаюць раскладацца, змяняючы хімічны склад паліва. А гэта, у сваю чаргу, нашкодзіць машыне.

Таксама ў шэрагу праблемаў, якія згадваюць аўтамабілісты, што залівалі навінку, — зніжэнне магутнасці матора, большы расход паліва і паскораны знос фільтраў. Рамонт дарагой машыны каштуе больш за ўяўнае ашчаджэнне на кожным літры дызеля.

Галоўная ж перавага біяпаліва — яно таннае. Праз прэзідэнцкі ўказ акцызы на яго зменшаныя. У якасці бонуса — з выхлапной трубы пачынае пахнуць блінамі. У вёсках за трактарамі бяжыць чарада катоў і сабак, якія прываблівае водар.

**Яўген Васількоў**

**Цэны на АЗС Беларусі**
Дызельнае паліва — 2580 рублёў
Біядызельнае паліва — 2220 рублёў

# Не прымушайце сябе гуляць



Гуляць з дзецьмі важна. Дзіця вучыцца адпаведным сацыяльным паводзінам, мацуецца і сувязь з бацькамі. Але адна справа — добраахвотна і радасна забаўляцца з сынам ці дачкой, а іншая — рабіць гэта з прынукі і па неабходнасці. Бо гульні — не адзіны спосаб правесці час разам.

Гуляючы, дзеці вучацца сацыяльным ролям, якія будуць граць у дарослым жыцці. Клопат пра ляльку, частаванне іншых дзяцей тортам з пяску і ратаванне бабулі з пажару — гэта навыкі, у якіх трэба практыкавацца, перш чым выкарыстоўваць сур'ёзна. Неацэнны элемент гульні — супольныя дзеянні з аднагодкамі, бо менавіта так дзеці вучацца сацыяльным паводзінам: імкненню да супольнай мэты, адстойванню свайго меркавання і падпарадкаванню рашэнням іншых. Да таго ж, паводле дадзеных даследчыкаў, гульні з аднагодкамі спрыяюць развіццю маўлення ў дзяцей: ім трэба такія ж, як яны, каб вучыцца размаўляць.

Гульні з бацькамі выконваюць іншыя функцыі. Перш за ўсё, баўленне часу разам служыць для ўмацавання сувязяў з найбліжэйшымі людзьмі — сувязяў, якія не страцяць важнасці на працягу ўсяго жыцця. Акрамя таго, дзякуючы гульням з бацькамі, дзеці пераймаюць дарослыя паводзіны наўпрост — ад людзей, якія з'яўляюцца найбольш аўтарытэтным для іх узорам.

Але наша культура часта змушае нас адчуваць, што мы вымушаныя гуляць з дзецьмі. Да гэтага нас падахвочваюць не толькі сродкі масавай інфармацыі, і не толькі разнастайныя грамадскія інстытуцыі ад нас гэтага чакаюць. Але жаданне гуляць з дзіцем залежыць не толькі ад настрою, але і ад псіхалагічных асаблівасцяў. Тое, што ў вас ёсць дзіця, не значыць аўтаматычна, што вы хацелі б гадзінамі кампаставаць квіткі ў гульні ў трамвай ці бегаць па хаце ў індзейскім апярэнні пасля вяртання з працы. Быць разам, будаваць сям'ю — гэта прыгода: вы спазнаеце вашае дзіця, а яно — вас, вашыя густы і запатрабаванні.

Ёсць і іншыя шляхі паглыблення адносінаў: казкі, сумесная выпечка торта, прыкручванне дзверак да шафы ці проста звычайная размова. Дзіцяці патрэбныя ад вас увага і адкрытасць. Але не прымушайце сябе ні да чаго, бо дзіця адчувае гэта і гульня губляе прыемнасць.

Сама ідэя гуляць з дзіцем у нашай культуры з'яўляецца адносна новай. Яна паўстала разам з канцэпцыяй дзяцінства ў канцы васямнаццатага стагоддзя. У Сярэднявеччы нікому з дарослых не магла прыйсці ў галаву ідэя пагуляць з дзецьмі! Дзеці бавілі час з аднагодкамі, а ў дарослых пераймалі дарослыя паводзіны. Разуменне дзяцінства як асобнага перыяду жыцця са сваімі законамі не існавала. Для маці і бацькі сын ці дачка былі проста малымі людзьмі — нават касцюмы дзяцей былі не чым іншым, як меншымі копіямі дарослых строяў.

Таму варта памятаць, што калі вы любіце гуляць з дзіцем — і яму, і вам вельмі пашанцавала. Аднак калі вы ў гэтым не знаходзіце задавальнення, не значыць, што вашае бацькоўства нічога не вартае. А яшчэ гульні з дзіцем змяняюцца, як у калейдаскопе, у залежнасці ад стадыі яго развіцця. Цалкам магчыма, што маці, якая не магла з двухгадовым дзіцем рабіць з пяску торт, да пяцігадовага прыбяжыць сама: «Ну, дава-а-а-а-а-ай у кіча!»

**Падрыхтавала КаМ**

НАВУКА

## Гены неандэртальцаў выяўленыя ў сучасных людзей



Значная колькасць людзей, якія жывуць цяпер, маюць у сваёй біялагічнай структуры гены неандэртальцаў. Гэты факт устанавіў навуковы калектыў са знакамітага Інстытута эвалюцыйнай антрапалогіі імя Макса Планка.

Даследаванні паказалі, што да 4% сучасных жыхароў Еўразіі маюць гены, якія дасталіся ім у спадчыну ад неандэртальцаў. «Неандэртальцы поўнасцю не зніклі, яны працягваюць жыць сярод нас у форме генетычнай спадчыннасці», — заявіў адзін з кіраўнікоў работ прафесар Сванте Паава.

Адкрыццё зроблена ў выніку поўнай расшыфроўкі генетычнага кода неандэртальцаў і яго параўнання з кодам сучасных людзей.

Неандэртальцы, якія разглядаюцца сучаснай навукай як тупіковая галіна развіцця чалавечага роду, насялялі Зямлю на працягу амаль 250 тысяч гадоў і вымерлі 24 тыс. гадоў таму. Доўгі час яны жылі побач з сучасным відам чалавека разумнага (homo sapiens), аднак, не вытрымаўшы канкурэнцыі з боку апошняга, зніклі.

Першыя людзі, якія прыйшлі на тэрыторыю Беларусі больш за 40 тысяч гадоў назад, былі неандэртальцы.

Навука лічыла, што продкі сучасных людзей і неандэртальцы, нягледзячы на відавую блізкасць, ніколі не ўтваралі сумесных пар і сем'яў. Аднак цяпер гэты пункт гледжання пастаўлены пад сумнеў.

**СМ, БЕЛТА**

## Сапраўдная беларуская кухня

### Галава дзіка (свінні)

1 галава дзіка (свінні), 0,75 л воцату, соль, 1 лыжка масла, 15—20 лаўровых лістоў, прыгаршчы духмянага перцу, набор карэння (морква, пятрушка, сельдэрэй), 5—6 цыбулін, 3—4 зубкі часнаку, хрэн або ягадны соус.

Вымачыць галаву на працягу некалькіх гадзінаў, заліць кіпнем, пачысціць, выняць язык, завязаць у сурвэтку і варыць у вадзе з воцатам, соллю, карэннем, цыбуляй і часнаком. Калі зварыцца, падаваць цёплай з хрэнам або ягадным соусам.

Калі галава дзіка падаецца на свята, то яе можна падаць і халоднай. Прыгатаваную азначаным вышэй спосабам галаву трэба тады астудзіць, упрыгожыць маянэзам, зялёнай пятрушкай, лімонам, тады страва будзе і смачная, і прыгожая.

**З кнігі В. Завадскай «Літоўская кухарка», 1864 г.**
**Падрыхтавала НБ**

## Прыватныя абвесткі

**ЗДАМ КВАТЭРУ**

**Здам двухпакаёвую** кватэру ў Мінску. Т.: (029) 757–94–07.

**ПРАДАМ**

**Прадам Біблію** за 5 тысяч рублёў. Т.: 8–0212–25–80–79.

**КАНТАКТЫ**

**Шукаю сяброў па перапісцы,** якія цікавяцца хрысціянскімі каштоўнасцямі, хрысціянскім ладам сямейнага жыцця і гісторыяй Беларусі. А/с 49, 210023, Віцебск.

**СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ**

**Запрашаем** у падарожжа 30 мая па маршруце: Мінск — Новая Мыш — Моўчадзь — Дварэц — Раготна — Рандзілоўшчына — Вензавец — Дзятлава — Мінск. Кантакты: (029) 111–73–32, (017) 262–73–43.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»**
(не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Кемікі



**1)** У талерцы ляжаць слівы, грушы, яблыкі. Усяго 10 фруктаў. Сліў на 7 больш, чым груш. Колькі сліў, яблыкаў і груш ляжыць у вазе?

**2)** Дачніца сарвала на абед 13 жоўтых, чырвоных і малінавых памідораў. Прычым чырвоных памідораў было сабрана на 10 больш, чым жоўтых. Па колькі штук сабрана чырвоных, малінавых і жоўтых памідораў?

**3)** За адну паездку на тачцы можна перавезці 2 мяхі бульбы. Колькі разоў трэба ехаць па бульбу, калі яе накапана 5 мяхоў?

**Сабрала Валянціна Карнялюк**
Адказы на старонцы 16.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Экалагічна чысты транспарт. Пад Мінскам прайшлі гонкі на ездавых сабаках.**



АНТОН МАТОЛЬКА

**Ноч музеяў сабрала аншлагі ў Мастацкім (на фота), Гістарычным, Багдановіча.**



**14 мая, у гадавіну Ганебнага рэферэндума, актывісты Маладога Фронту вывесілі ў цэнтры Мінска бел-чырвона-белыя сцягі.**



**Міс ЗША стала дзяўчына арабскага паходжання. Гэта 24-гадовая Рыма Факіх, ураджэнка Лівана са штата Мічыган. Дзяўчына мае ступень бакалаўра мастацтва і скончыла праграму бізнэс-менеджменту ў Мічыгане. Каб сабраць грошы на ўдзел у конкурсе, Рыма прадала свой аўтамабіль.**

**Капітан бераставіцкай міліцыі змайстраваў квадракоптэр — беспілотны апарат з відэакамерай, каб высочваць самагоншчыкаў і браканьераў па лясах.**



## Анекдоты

* * *

Радзіму і прэзідэнта не выбіраюць!

* * *

Пенсіянерка Панасевіч зразумела, што перабрала з угнаеннямі толькі пасля таго, як кабачкі спалілі яе лецішча.

* * *

Камбайнер Хведар прабіў сцяну і заехаў проста ў кухню свайго дома, такім чынам ператварыўшы звычайны камбайн у кухонны.

* * *

— Мне ўчора жонка зрабіла падарунак!

— Які?

— Заснула проста перад пачаткам Чэмпіянату свету па хакеі.

* * *

У Расіі жахлівае мінулае і вялікая будучыня! І так будзе заўжды...

* * *

У кансерваторыі на экзамене па вакале абітурыентка пытаецца ў выкладчыка:

— Скажыце мне шчыра: мой голас ні на што неварты?

— Не, чаму! Ён можа прыдацца, напрыклад, падчас пажару ці абрабавання.

* * *

Пінгвін і зебра прыйшлі ў фотаатэлье.

— Будзем рабіць каляровае фота? – пытаецца фатограф.

— Не, дастаткова чорна-белай.

## «НН» сто гадоў з вамі

У апошнім нумары «Нашай Нівы» мы выказалі думку, што пасля смерці англіцкага караля Эдуарда VII можна чакаць вялікіх перамен у міжнароднай палітыцы. Так яно, бадай, папраўдзе выходзіць. Ведама, гаварыць ужо цяпер аб якой-небудзь вайне нельга, але ўсё ж такі відаць, што агульны мір можа лёгка расстроіцца прыпадкам, каторага ніхто не чакае.

**«НН». № 19. 1910**

Баранавіцкая міліцыя затрымала відэапірата. На офісе прадпрымальніка выяўлена і канфіскавана 25 відэамагнітафонаў, абсталяванне для запакоўкі, 1811 запісаных і 150 чыстых касетаў.

**«НН». № 19. 2000**

**Адказы да старонкі 15:**

1) 8 сліў, 1 груша, 1 яблык; 2) 11 чырвоных, 1 жоўты, 1 малінавы; 3) 3 разы

**Наша Ніва**

незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**

З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6350.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 23.00 18.05.2010.

Замова № 2362.

Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.

Цана дамоўная.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 1819-1614